Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 170 (5003)
жніўня
3
пятніца
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—НЯСТОМНА ПРАЦАВАЦЬ НАД СПРАВАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ. А. МАРКАЎ—ДЫСПЕТЧАРСКУЮ СІСТЭМУ КІРАЎНІЦТВА—ПРАДПРЫЕМСТВАМ БЕЛАРУСІ. АРХІПАЎ—ЗАМАЦАВАЦЬ АСНОЎНЫЯ КАДРЫ Ў СОЎГАСАХ. МЕЛЬНІКАЎ—ЯК Я ПРАВОДЖУ РАБОТУ З КАЛГАСНЫМ АКТЫВАМ. САПЕГА—СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА—Ў АСНОВУ РАБОТЫ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ.

ПРЫЕЗД ЛІТОЎСКАГА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ У МАСКВУ ЗА МЯЖОЙ:

ПАМЕР ГІНДЭНБУРГ.

ПОСТ ПРЭЗІДЭНТА АБ'ЯДНАЕЦЦА З ПАСТОМ РЭЙХСКАНЦЛЕРА.

САЛДАТЫ РЭЙХСВЕРА ПРЫВОДЗЯЦЦА ДА ПРЫСЯГІ ГІТЛЕРУ.

АНТЫВАЕННЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ І МІТЫНГІ.

НЯСТОМНА ПРАЦАВАЦЬ НАД СПРАВАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Сельска-гаспадарчы 1934 год БССР пачала буйнейшымі перамогамі ў барацьбе за высокі ўраджай. З поспехам правёўшы багатоўчую кампанію 1933 года, наша рэспубліка як ніколі арганізавана правяла веснавую пасеўную 1934 года. Але гэтыя поспехі не павінны кружыць нам галаву (а ва многіх таварышоў гэта галавакружэнне ў наяўнасці). МОЦНАСЦЬ нашых поспехаў, іх ЗНАЧЫМАСЦЬ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПАБУДОВУ БЯСКЛАСАВАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА—вымяраецца ў значнай меры тым, як нам—рэспубліцы, дзе ПАЛАВІНА бядняцка-серадняцкіх гаспадарак знаходзіцца яшчэ ПА-ЗА калгасамі—удаецца ўцягнуць у калгасы працоўных одиасобнікаў. І калі з ГЭТАГА пункту гледжання мы расцэнім нашу работу, то мы будзем чымушаны прызнець, што наша БССР адстала абсалютна ад усіх рэспублік і краёў Совецкага Саюза. Мы адстаем і ад спаборнічаючай з намі Заходняй вобласці.

Ставіцца пытанне—чым-жа выклупмачыць гэты супярэчлівы факт? З аднаго боку, буйнейшыя поспехі ў выкананні сельска-гаспадарчых кампаній, у арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, у барацьбе за высокі ўраджай, з другога—крайне павольныя тэмпы калектывізацыі. Хіба калгасы за апошнія гады не ўмацаваліся, не паляпшыўся іх добрабыт? Хіба з кожным днём не паляпшаецца становішча калгасаў у параўнанні з аднаасобнікамі? Хіба УВЕСЬ ХОД нашай социялістычнай будоўлі не агітуе за калгас? Хіба працоўны аднаасобнік СУПРОЦЬ совецкай улады, СУПРОЦЬ калгасаў?

Аднаасобнікі—неаднародная маса. Частка іх—невялікая — уступіла на шлях бадзяжніцтва. Частка іх бесперапынна ідзе на будоўлі, у гарады, у соўгасы. Але асноўная маса аднаасобнікаў—гэта тружанікі палёў, заўтрашнія калгаснікі. І МЫ ПАВІННЫ ПРАМА СКАЗАЦЬ: КАЛІ ТЭМПЫ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПА БССР ГАНЕБНА ПАВОЛЬНЫЯ, ТО ВІНАВАТЫ Ў ГЭТЫМ МЫ—КОМУНІСТЫ, МЫ—КАЛГАСНЫЯ АКТЫВІСТЫ. Як правіла, аднаасобнік прадастаўлен сам сабе. Мы пытаемся: колькі ёсць комуністаў, прымацаваных хоць-бы да буйных аднаасобных вёсак, падчас налічваючых 100 і больш двароў, для вядзення сістэматычнай арганізацыйна-масавай работы? Наўрад ці знойдзем мы такіх. У большасці вёсак прадстаўніка РК або РВК бачаць не больш, як 1-2 разы ў год, дый то амаль выключна па пытаннях загатовак. А дзе мы знойдзем сістэматычную работу з аднаасобнікамі, РАСТЛУМАЧЭННЕ ім поспехаў социялістычнай будоўлі, наглядны паказ перавог калгаснай працы?

Пасля гістарычнай прамовы таварыша Сталіна мы правялі ўзрамадную работу ў калгасах, але, як правіла, мы Ў БССР упусцілі пры гэтым задачу ДАЛЕЙШАЙ калектывізацыі. Стварыўся недапушчальны самацёк. Між тым, цэлы рад прыкладаў гаворыць аб тым, што самая мінімальная арганізацыйна-масавая работа сярод аднаасобнікаў неадкладна дае прыліў у калгасы. Вось, напрыклад, СТАРЦАЎСКІ СОВЕТ, БАБРУЙСКАГА РАЁНА. Працавала тут перад веснавой сяўбой 15-20 дзён выязная рэдакцыя раённай газеты «Комуніст» і ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПА СЕЛЬСОВЕТУ АДРАЗУ ЎЗНЯЎСЯ З 28,5 ДА 60,8. Варта было ШЭФСКАЙ арганізацыі бабруйскай швэйнай фабрыкі дапамагчы МЫШКОВІЦКАМУ сельсовету арганізаваць хату-чытальню, нападзіць рэгулярную масавую работу, умацаваць калгасы сельсовета, як у калгасы пацягнуліся аднаасобнікі. Быў створан нават новы калгас імя Кагановіча. Вядома, што варта было палітаддзелу РАГАЧОЎСКАЙ МТС узяцца за справу калектывізацыі, як за адну веснавую пасеўную процант калектывізацыі па зоне дзейнасці МТС падвоіўся. Можна, нарэшце, спаслацца на БАРЫСАЎ, дзе ў апошнія тыдні ўліпося ў калгасы НЕКАЛЬКІ СОТ аднаасобнікаў. Прыклад Барысава тым больш цікавы, што ён наглядна абвяргае апартуністычныя размовы аб немінучым застоі з калектывізацыяй у раёнах суцэльнай калектывізацыі. Барысаў яшчэ ў 1933 годзе стаў раёнам суцэльнай калектывізацыі і верта цяпер, пасля чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б), раённаму кіраўніцтву ўзяцца за справу калектывізацыі, як у калгасы пайшлі сотні аднаасобнікаў.

Аднаасобная вёска—гэта ўчастак абвостраных класавай барацьбы. Кулацкае аховсце, прапязаючы ў калгасы з мэтай узарваць іх знутры, адначасова вядзе шалёную работу сярод аднаасобнікаў, супроць калгасаў. Па раду вёсак (напрыклад, Сораж, Кухта, Слуцкага раёна) адкрыта працуюць кулацкія агітпропшчыкі», якія чытаюць аднаасобнікам газеты, каментуюць пасвойму, падбухторваюць іх супроць калгасаў.

ПЕРШАЯ задача, стала быць, такая: ПАКОНЧЫЦЬ З САМАЦЁКАМ У СПРАВЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ, РАЗГАРНУЦЬ ШТОДЗЕННУЮ АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАСАВУЮ РАБОТУ СЯРОД АДНААСОБНІКАЎ І ТАДЫ КРЫВАЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ПОЙДЗЕ ЎВЕРХ.

Справу калектывізацыі нельга рушыць наперад, не пакончыўшы з тым папушчэннем, якое мае месца жаль ва ўсіх раёнах у адносінах сабатажу часткай аднаасобнікаў выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай; не пакончыўшы з нецярпімым папушчэннем у адносінах утойвання часткай аднаасобнікаў сваёй ворнай зямлі; рашуча не перарываючы кулацка-шкодніцкай работы раду землеўпарадчыкаў, адводзячых лепшую частку зямлі аднаасобнікам; не наносячы з усёй рашучасцю ўдару па кулацка-заможнай частцы аднаасобнай вёскі, сабатуючай загатоўкі і абавязковыя павіннасці. Практыка «сярэдніх лічбаў» прывяла к таму, што частка аднаасобнікаў сістэматычна не выконвае абавязковых паставак, фінансавых плацяжоў, дарожных павіннасцей. У Курычоўскім сельсавеце (Петрыкаўскі раён), дзе пераважае аднаасобнік, ухітрыліся і школу будаваць за кошт калгасаў. Гніла-ліберальныя адносіны раённых і сельскіх арганізацый да кулацкіх сабатажнікаў толькі даюць зброю ў рукі апошніх для барацьбы супроць калектывізацыі. Хіба мала ў нас такіх, як вёска Макадовічы, Петрыкоўскага раёна, дзе рад аднаасобнікаў былі саўдзельнікамі паравога млына, мелі батракоў, па некалькі коней, валоў, дзесяткі авечак і на абкладаюцца індывідуальным падаткам? Хіба не правы калгаснікі, калі яны на пленумах сельсавета патрабуюць, каб было забяспечана стопроцантнае выкананне аднаасобнікамі іх абавязацельстваў па школьнаму, дарожнаму будаўніцтву, па падатках, паставках і т. д. ПАКОНЧЫЦЬ З ПАПУШЧЭННЕМ У АДНОСІНАХ ТАКІХ АДНААСОБНІКАЎ — гэта значыць выбіць зброю ворага ў яго барацьбе з калектывізацыяй. Мы не можем дапусціць таксама ўтойвання зямлі аднаасобнікамі. Між тым, вядома, у такіх раёнах, як ГОРАЦКІ, аднаасобнікі пры папушчэнні раённых і сельскіх арганізацый утойваюць ТЫСЯЧЫ ГЕКТАРАЎ зямлі. У Бабруйскім раёне па аднаму толькі Гарбацэвіцкаму совету пры кантрольным абмеры было выяўлена 126 гектараў утоенага аднаасобнага пасеву. Паўстае пытанне: чаму раёны баспакараюць дазваляюць утойваць зямлю? Чаму раёны дазваляюць кулацкім агентам як, напрыклад, у Марыцвіцкім сельсавеце, Петрыкоўскага раёна, у Боўшыцкім сельсавеце, Слуцкага раёна, адводзіць лепшую зямлю аднаасобнікам, даводзячы размер аднаасобных сядзіб да 2 з пап. —3 гектараў. Пара, нарэшце, зразумець, усё гэта папушчэнне ЎЗМАЦНЯЕ ХІСТАННІ АДНААСОБНІКАЎ, СТВАРАЕ ЗАКОННАЕ НЕЗДАВАЛЕННЕ Ў КАЛГАСНІКАЎ і з ім павінна быць неадкладна пакончана.

Трэцяя задача, якая стаіць перад намі—гэта падцягванне АДСТАЮЧЫХ КАЛГАСАЎ. Налічваецца гэтых адстаючых калгасаў тармозіць справу калектывізацыі, дае козыр у рукі ворагаў калектывізацыі. Возьмем для прыкладу ПЕТРЫКОЎСКІ раён. У Бабрыкоўскім совеце, дзе калгас «Большэвік» арганізацыйна - гаспадарча адстаў, там у вёсцы Бобрыкі каля 150 гаспадарак яшчэ па-за калгасам. А побач, у цэнтры, у Камаровіцкім совеце, дзе ў наяўнасці моцны калгас «Х з'езд», пераважная частка жыхароў вёскі ў калгасе.

Падцягнуць адстаючыя калгасы, кінуўшы туды лепшыя сілы—наша важнейшая палітычная задача.

І, нарэшце, не менш важна пытанне—аб ЧУЛЫХ АДНОСІНАХ да калгасніка, аб перасячэнні практыкі агульных і неабгрунтаваных выключэнняў з калгасаў. Калгасы не эдзелены кітайскай сцяной ад аднаасобнай вёскі. Як жыве калгаснік, якія парадкі ў калгасе—усё гэта прадрашае настрої аднаасобніка ў адносінах яго ўступлення ў калгас. Між тым, мы маем шматлікія факты агульных выключэнняў. У СЛУЦКІМ раёне вымушаны былі аднавіць амаль палавіну выключаных. Мы-ж павінны зразумець, што для працоўнага вёскі няма ўдару больш, як выключэнне яго з калгаса. ПАКОНЧЫЦЬ З ПЕРАГІБАМІ Ў ПЫТАННІ АБ ВЫКЛЮЧЭННЯХ, РАШУЧА АДЗЁРНУЦЬ «ЛЯВАЦКІХ» АДМІНІСТРАТАРАЎ Ў КАЛГАСАХ — важнейшая задача дня.

Рашучую барацьбу мы павінны аб'явіць бяздушным адносінам да калгасніка. Уся гэта штрафаманія, калі штрафуюць палавіну брыгады, уся гэта непатрэбная «эканомія» цягла, калі ў пасеўную або ўборачную адмаўляюць калгаснику з'ездзіць у больніцу або яшчэ па якой-небудзь сапраўды неадкладнай справе, усё гэта непатрэбнае адміністраванне, калі калгасніка ставяць без лішняй патрэбы на работу, якая яму не па душы,—усе гэтыя грубыя палітычныя памылкі, якія тармозяць справу ўмацавання калгасаў, тармозяць справу далейшай калектывізацыі.

Наша рэспубліка і ўвесь СССР уступілі ў адказны перыяд уборкі і загатовак. Будзем-жа так працаваць, каб не толькі датэрміновa выканаць загатоўкі, але і выклікаць новы масавы прыліў у калгасы; будзем так жа змагацца за кожны процант калектывізацыі вёскі, сельсовета, раёна, рэспублікі.

Індывідуальная здзельшчына—аснова большэвіцкіх тэмпаў уборкі

ТАМ, ДЗЕ ПРАЦУЮЦЬ СКОПАМ, ТАМ ЗРЫВАЮЦЬ УБОРКУ, ТАМ ГУБЯЦЬ УРАДЖАЙ

ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЗДЗЕЛЬШЧЫНА Ў ДЗЕЯННІ

МЫ ПАКАЗВАЕМ СЁННЯ ВОПЫТ ПРЫМЯНЕННЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ ЗДЗЕЛЬШЧЫНЫ Ў ЛЁЗНЕНСКІХ І ДЗЕРЖЫНСКІХ КАЛГАСАХ. ГЭТЫ ВОПЫТ ЛІШНІ РАЗ ДАКАЗВАЕ, ШТО ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЗДЗЕЛЬШЧЫНА — АГРАМАДНАЕ ПАВЫШЭННЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ. І ТАМ, ДЗЕ САБАТУЮЦЬ ІНДЫВІДУАЛЬНУЮ ЗДЗЕЛЬШЧЫНУ, ТАМ ЗРЫВАЮЦЬ УБОРКУ, ТАМ НА СПРАВЕ ГРАЮЦЬ НА РУКУ КУЛАЦКІМ ЭЛЕМЕНТАМ.

ШТО ЗАБЯСПЕЧЫЛА ПОСПЕХ ЦЕРАБЛЕННЯ ІЛЬНУ

4-я ВРЫГАДА калгаса «ПРОФІНТЭРН», Калышанскага сельсавета, Лёзненскага раёна, скончыла цераблянне ільну ў стадыі ранняй мяўтай спеласці. Выцераблена з плошчы ў 37 га, з плошчы ў 5 га абмалочана і развешана. ЦЕРАБЛЕННЕ ПРАВОДЗІЛАСЯ ПАДВОЙНЫМ ОПОСАВАМ З АБАВЯЗКОВЫМ САРТАВАННЕМ ІЛЬНУ ПА ДАЎЖЫНІ І ТАЎШЧЫНІ СЦЯБЛА І ПА КОЛЕРУ.

ПОСПЕХ ЦЕРАБЛЕННЯ ЗАБЯСПЕЧЫЛА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЗДЗЕЛЬШЧЫНА, якую мы ўвялі ў брыгадзе пасля праведзенага 20 ліпеня палітдня па распрацоўцы рашэнняў пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Да 20 ліпеня ўстаноўленыя нормы ў 0,10 га многімі церабільшчыцамі не выконваліся. Прычынай было спазненне на работу і доўгія перапынкі на абед. Пасля палітдня мы ўстанавілі такое налічэнне працадзён: за кожную выпрацаваную звыш нормы сотую гектара мы налічвалі працадні ўдвайне. Акрамя таго, ШТОДЗЕННА ПРЭМІРАВАЛІ ЛЕПШЫХ ЦЕРАБІЛЬШЧЫЦ У СУМЕ АД 3 ДА 10 рублёў.

Такі метад работы забяспечыў тэмпы і якасць цераблення.

Малоцім лён на машыне «ЭДДЗІ», рассціпаем яго на сухадомных сенажацях.

Для апрацоўкі трасты мы падрыхтавалі сухія дровы, тры мяльна-сушыльныя пункты і тры ручныя драўляныя мялкі. У адзнаку юбілея «Звязды» здалі дзяржаве 10 цэнтнераў ільносемя. К 3 жніўня абмалот, рассціп і здачу ільну скончым.

У гэтым годзе мы будзем здаваць валакно № 14—16.

Я—брыгадзір і ўдзельнік Усебеларускага злёта брыгадзіраў—добра памятаю словы тав. ГІКАЛО аб тым, што барацьба за лён—наша галоўная задача.

ПЧОЛКА АЛЕСЬ—брыгадзір 4-й брыгады калгаса «ПРОФІНТЭРН», Калышанскага сельсавета, Лёзненскага раёна.

ШТО ДАЛА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ЗДЗЕЛЬШЧЫНА НА УБОРЦЫ ЗЕРНАВЫХ

Калгасы зоны дзейнасці Дзяржынскай МТС да масавай уборкі зернавых прыступілі з 20-23 ліпеня.

Рад калгасаў прышлі да гэтай ад'ежнай кампаніі значна лепш падрыхтаванымі, чым усе мінулыя гады.

Цэлы рад калгасаў важнейшую зернавую культуру—жыта—зжалі за 4-5 дзён. Поспехі гэтых калгасаў з'яўляюцца рэзультатам больш за ўсё прымянення індывідуальнай здзельшчыны па рабоце ўсімі сродкамі ўборкі (жняяркі, косы, сярпы). У калгасе «Чырвоны баец» індывідуальная здзельшчына прымянялася наступным парадкам. Да выхаду на ўборку кожнае звяно жней, кожны касец і кажная жняярка атрымалі свой уборачны ўчастак. Участак ад участка аддаляўся колікам з дошчанкай, на якой аднаачалася звяно, брыгада або касец ці машыніст а жняяркай, якія будуць яго ўбіраць. У кожнай брыгадзе быў складзен канкрэтны план: хто на які спосаб зробіць вызначаецца і якое заданне за 6 дзён павінен выканаць.

Так выйшлі ў поле. Звенні ручнога жніва атрымалі план, удасканавалі яго яшчэ больш у рабоце. Пакажам гэта на практыцы звяна Карачун Надзі, з брыгады №1. Атрымаўшы свой участак, Карачун Надзя падзяліла яго паміж жнеямі, якія працавалі паадзіку. Толькі таму кожная калгасніца выжынала густога жыта замест нормы ў 11 сотых па 16-17 сотых гектара. Пры такой арганізацыі працы нават 65-гадовая калгасніца Каспяровіч Варвара выжынала ў дзень па 13-14 сотых гектара.

Індывідуальная здзельшчына б'е па ўсякай кулацкай агітацыі супроць норм выпрацоўкі, за скарыстанне «бочак для разбазарвання працадзён. У калгасе «Большэвіцкая сяўба» кулацкаму агенту Будай Марылі, якая прыкрылася маскай актывіста, удалося з пачатку з'агітаваць многіх калгасніц, каб галасавалі за норму выпрацоўкі на жніве ў 0,09 гектара. Але дастаткова было дабіцца ўвядзення індывідуальнай здзельшчыны, каб агітацыя падкулачніцы Будай Марылі была разбіта ўшчэнт. Тыя-ж калгасніцы, якія выжынялі ў першы дзень па 8-9 сотых, пачалі перавыконваць нормы. Калгасніцы Папраўка, Савасцюк, Пятровіч і інш. пачалі выжынаць па 16-20 сотых гектара. І калгас ідзе адным з перадавых па ўборцы.

Такі-ж валікі эфект індывідуальная здзельшчына дае і пры ўборцы машынамі. У калгасе «Комунар», акрамя конных і трактарных жняярак, не прымяняліся ніякія іншыя сродкі ўборкі. І першыя два дні ўборкі пагражалі зацяжкай. Жняяркі працавалі гуськом, не на цвёрда вызначаных участках, не выконвалі норм і т. д. І калі палітаддзел мабілізаваў на ўвядзенне індывідуальнай здзельшчыны на машынах усю партарганізацыю калгаса, справа пашла на паляпшэнне. Адразу большасць жняярак пачалі перавыконваць нормы, зніклі паломкі і калгас «Комунар», які заўсёды адставаў ад іншых калгасаў, адным з першых за 5 дзён ажаў жыта.

Рэдактар палітаддзельскай газеты «Большэвіцкі сцяг»
РАТКЕВІЧ.

ЕЛЬСК

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СЕЛЬСОВЕТ—ПЕРАДАВІК УБОРКІ І ЗАГАТОВАК

(Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

1 жніўня ў Ельскім раёне арганізаван чырвоны абоз у азнаменаванне пяцітысячнага нумара «Звязды». Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі нацыянальнага нямецкага сельсавета ўнеслі прапанову выступіць праз «Звязду» з пісьмом. Прывядзем тэкст гэтага пісьма.

«Мы, калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі нацыянальнага нямецкага, Роза-Люксембургскага сельсавета, у азнаменаванне выхаду пяцітысячнага нумара «Звязды»—цэнтральнага органа комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі—сёння арганізавалі чырвоны абоз па пастаўцы нашай пролетарскай дзяржаве хлеба. У абозе—58 фурманак аднаасобнікаў і 6 вазоў калгаснага хлеба калгаса «Сцяг рэволюцыі».

Гэты наш чырвоны абоз з'яўляецца ітогавым па выкананню паставак жыта і ячменю дзяржаве ў лік хлебапаставак 1934 года.

Наш нацыянальны нямецкі сельсавет мае вялікія поспехі на гаспадарчым і культурным фронце. Мы ўжо поўнасцю ўбралі азімыя і ячмень, засціртавалі і малоцім. Адначасова прыступілі да ўборкі аўса, грэчкі і цераблення ільну. Вядзем барацьбу са стратамі пад лозунгам—ніводнага коласа не пакінуць на полі.

Рашаючую ролю ў поспеху ўборкі адыграла каса. Мы не любім сярпа, у дапамогу машыне поўнасцю скарыстоўваем касу.

Нядрэнна ў нас і з сенапастаўкамі. Па сельсовету гадовы план выкананы на 81 проц. За гэтыя поспехі наш сельсавет атрымаў пераходны чырвоны сцяг райкома і райвыканкома.

Мы атрымалі пераходны сцяг таму, што працавалі добра. Але мы на гэтым не спынімся, будзем працаваць яшчэ лепш, высокаякасна выканаем уборку ў тэрмін, выканаем усе абавязацельствы перад дзяржавай датэрмінова: хлебапастаўкі да 20 жніўня, сеназагатоўкі—ў бліжэйшыя 5 дзён.

Будзем высока і моцна трымаць заваяваны пераходны сцяг.

Усё гэта з'яўляцца лепшым доказам адданасці нашаму совецкаму ўраду і комуністычнай партыі і лепшым адказам на фашысцкую брахню аб галечы нямецкага насельніцтва ў Совецкім Саюзе. Мы не хочам і не просім вашай дапамогі, паны фашысты. Мы шчаслівы і рады, што жывем у краіне дыктатуры пролетарыята і сумесна з іншымі нацыямі будуем социялізм.

Парторг сельсавета ГЕТХЕН, старшыня сельсавета ШЫЛЛЕР, старшыня калгаса ЧЭРНЯК, ТЫЛКО, ФРЭЙДЭР ЭДВАРД, ШЭЎЧЭНКА, ГЕНРЫС РЫЧАРД, РУБЕЙН, ГЕЦТЭ, ГЕНЕР, ВЫТЧЭ, ГРАПАТЫН, ГАМЕРНІК, ШМІДТ, СТЭЙТЛЕР, ФАЙМОН, ГОТТЭ, ГЕРМАН, НЕЙЕРЖЫЦКІ, ОРДЛІБ.

У ЧАУСКІМ РАЕНЕ НЯМА БОЛЬШЭВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА УБОРКАЙ

Мы друкуем сёння матэрыялы аб уборцы ільну і зернавых у Чаускім раёне.

Абедзве карэспандэнцыі гавораць аб адным: ні Чаускі РК, ні партыйны аддзел не кіруюць уборкай. Пісаніны і балбатні многа, а на справе мацёк. У рэзультаце большасць ільнацерабілак стаіць. Лён цярэбяць без сартоўкі. Большасць жняярак не працуе. Касу ігнаруюць. Урэдзь перапрастойвае на корні. Устае пытанне, аб чым думаюць чаускія раўнікі, няўжо яны не разумеюць, што неправядзенне ў жыццё апошніх указанняў партыі аб уборцы на справе азначае зрыў генеральнай лініі партыі?

ТУТ ЗБІРАЮЦЦА ПСАВАЦЬ ЛЁН ЯК ЛЕТАСЬ

ЧАУСЫ. (Ад спецыяльнага карэсп. «Звязды»).

На 25 ліпеня па раёну выцераблена толькі 4,3 проц. засеянай плошчы ільну. У асноўных ільнаводчых сельсаветах (Сукарэўскім, Дужаўскім, Хацетаўскім, Холмаўскім, Зарасцянскім, Амхініцкім і інш.) нават не пачыналі цераблення.

— Нічога, паспеем, — кажа старшыня калгаса «Зара Окцябра», Амхініцкага сельсавета, Паўленка, — закончым уборку зерневых, тады і за лён возьмемся.

Такія настроі ўласцівы не толькі Паўленку. Яны ёсць амаль ва ўсіх калгасах паказаных сельсветаў.

У Чаускай МТС 29 ільнацерабілак «Комсамолка». Павоцле даных дырэкцыі МТС (т. Равіс) з гэтай колькасці толькі (?) 4 не адрамантаваны, а астатнія працуюць у калгасах.

Калі-ж заглянуць у калгасы, то ўбачым зусім іншы малюнак. У калгасах «Памяць Леніна» і «Новы свет» «Комсамолкі» стаяць неадрамантаванымі, а ў радзе іншых калгасаў яны хоць і адрамантаваны, але не скарыстоўваюцца з-за адсутнасці спецыялістаў.

Возьмем калгас імя Сталіна. Тут даве «Комсамолкі». Яны знаходзяцца на полі, працуюць. Але як? Выпрацоўка кожнай церабілкі не перавышае 1 га ў дзень. Як правіла, палову рабочага часу яны прастойваюць. Больш таго, нават і такім чынам яны «працуюць» толькі ў адну змену.

У чым-жа справа? да «Комсамолак» прымацаваны ў якасці машыністаў калгаснікі, якія зусім незнаёмы з машынай. У рэзультаце — штомінутныя затрымкі і прастоі. Церабілкі не змазаны, і нават на халастым ходу коні ледзь-ледзь могуць зрушыць іх з месца.

Кіраўніцтва МТС не толькі падрыхтавала вадзіцеляў цераблак, але нават не падумала аб тым, каб правільна скарыстаць спецыялістаў, якія ўжо ёсць. У калгасе «Перабудова», Благаўшчынскага сельсавета, адказны за цераблянне Підронаў добра вядае машыны. Яны ў яго добра працуюць, выконваюць норму. Але побач, у калгасе «Новы свет» «Комсамолка» стаіць, бо нямае яму яе пусціць у работу.

Не лепш справа з арганізацыяй працы па ўборцы ільну ў ручную. У тым-жа калгасе імя Сталіна, у участку брыгады № 2 цярэбяць ручнымі лён некалькі калгасаў, раскінутых па полю групкамі.

— Якая ў вас норма выпрацоўкі? — пытаемся ў іх.

— Хто яе ведае... Нам пра гэта нічога не казалі.

Падобную «арганізацыю працы» можна сустрэць амаль у кожным калгасе раёна.

Некалькі слоў аб далейшым працэсах работы з ільном. У лепшым выпадку лён пакладаецца полі ў снапках, а звычайна жыць раскінутым па ільнішчы. Малацьба адкладзена «на пасля». На складзе «Белсельснаба» стаяць 25 машын «Эддзі», а калгасы не думаюць іх забіраць.

Кіраўнікі раёна і калгасаў добра ведаюць, што барацьба якасць ільнавалакна пачынаецца з цераблення, што ў гэты час патрэба сартаваць. Але яны нічога не робяць, каб укараніць практыку сартавання. Калгаснікі здзіўлена пытаюць:

— Хіба пры цераблянні можна сартаваць?

Так у Чаусах «змагаюцца» за высокакласнае ільнавалакно.

В. К—р.

ЧАСТКА ЎРАДЖАЮ ЗЕРНАВЫХ АСТАЕЦЦА НА ПОЛІ

ЧАУСЫ. (Карэспандэнт «Звязды»).

Ужо на аснове ўрокаў першых дзён уборкі зернавых па Чаускаму раёну ёсць усе падставы, каб зрабіць зусім акрэслены вывад: ва многіх калгасах раёна шырока распаўсюджаны кулацкія настрої, накіраваныя на зацягванне ўборкі, на павелічэнне страт.

Па-першае, тут мае месца жаданне (і практыка) не скарыстоўваць на ўборцы збожжа жняяркі;

па-другое, нярэдкі выпадкі злоснага ігнаравання касы;

нарэшце, з рук вон дрэнна арганізавана барацьба са стратамі.

Пяройдзем да фактаў і ўскрыем іх прычыны.

— На якое ліха нам жняяркі,—кажа старшыня калгаса «Серп і молат», Рябцэўскага сельсавета, т. Фёдараў:—мы і рукамі як-небудзь убярэм збожжа.

Гэта, па сутнасці кулацкая «установка» старшыні калгаса падмацоўваецца адпаведнай практыкай. У гэтым калгасе толькі на пяты дзень жніва на поле вышлі 2 жняяркі, пры чым работа іх была «наладжана» так, што яны за дзень зжалі не больш як па 0,5 га. Больш таго—адна машына ў першы-ж дзень выхаду ў поле сапсавалася і не рамантуецца. Другая машына выкарыстоўваецца на рабоце не больш як па 7-8 гадзін у дзень.

Такія-ж факты можна прывесці з калгасаў «Усходняя зара», «Чырвоны партызан» і т. д.

А вось прыклад іншага парадку. У калгасе імя Сталіна (Чаусы) працуюць 2 жняяркі бесперабойна, у 2 змены. Але як працуюць? Усё поле пакрыта агрэхамі—цэлымі палоскамі збожжа пакідаецца на полі няжатым.

У рэзультаце калгаснікі незадаволены работай машын. Хіба гэта не праяўленне кулацкай тактыкі—шляхам дрэннай работы машын выклікаць у калгаснікаў антымеханізатарскія настрої?

Не лепш і з прымяненнем на ўборцы зернавых касы. У калгасе «Баявік» (старшыня Бессмертны) усё жыта намерыліся ажаць рукамі і тады толькі ўзяцца за жніво аўса. А між тым авёс даўно пераспеў. Усё-ж тут кос не хочуць прымяняць.

Неабходна звярнуць увагу па наступны факт: кулацкія элементы радзе калгасаў агітуюць супроць касы ў часе яе прымянення. Вось прыклад, у калгасе імя Сталіна, а з мест таго, каб праінструктаваць касцоў і прыладзіць да кос аднаваныя прыстасаванні, даручылі касіць ячмень каму папала, пазатыкалі косы, для выгляду, кавалачкі дзіка, і ў рэзультаце якасць касьбы вельмі нізкая. Па полі замест ровных пракосаў ляжаць кучы збожжа. І гэта ў той час, калі тут-жа некаторыя калгаснікі, якія да касы прыладзілі грабелькі, даюць высокаякасць уборкі таго-ж ячменю.

Ужо вышэй пералічаныя факты адначасова служаць ілюстрацыяй таго, як у Чавусах «змагаюцца» супроць страт. Але гэтага мала. У тым-жа калгасе імя Сталіна за касцамі жняяркамі збожжа не вяжацца і ляжыць на пожні па 3-4 дні. А вяжнае жыта ставіцца ў бабкі без «шапак» і пры самым маленькім дажджу прамакае.

Амаль нідзе вы не сустрэнеце ваў, падрыхтаваных для перавозкі збожжа, абшытых палатном, каб не дапусціць страт.

— Мы,—кажа старшыня калгаса «Новы свет» Губароў,—не ўмеем гэтага зрабіць...

Як правіла, збіранне каласоў арганізавана да канца ўборкі.

Чым-жа тлумачацца ўсе гэтыя факты?

Перш за ўсё своеасаблівымі метадамі кіраўніцтва калгасамі з боку райза (заг. Сваткоўскі) і МТС (дырэктар Равіс).

Калгасы дагэтуль не маюць апрацаваных уборачных планаў. Ніхто з раёне нічога не робіць, каб падрыхтаваць кадры для работы на жнярках; нічога не зроблена для таго, каб скарыстаўшы вопыт тых калгасаў, дзе прымянялася каса на ўборцы збожжа, падрыхтаваць належным чынам касцоў.

Такое становішча з уборкай збожжа ёсць, перш за ўсё, вынік абсалютнай бяздзейнасці раённых кіруючых арганізацый і таго, што класава-варожай агітацыі і практыцы былі процідастаўлены належна падрыхтоўка і арганізацыя ўборачных работ.

В. ДАЛЬ.
С. КАЗНАЧЭЕЎ.

ЛІПЕНЬСКІ ПЛАН ХЛЕБАПАСТАВАК НЕ ВЫКАНАН

РУЙНУЮЧЫ АДПОР АНТЫДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭНДЭНЦЫЯМ!

Выкананне дзяржаўнага плана збожжапаставак з'яўляецца першачарговым абавязкам усіх калгасаў, усіх аднаасобнікаў. Перадавыя калгасы і раёны усвядомілі гэтыя ўказанні партыі і ўрада і па-большэвіцку разгарнулі хлебаздачу.

Асобныя калгасы і працоўныя аднаасобнікі ўжо выканалі гадовы план хлебаздачы. На аснове большэвіцкага разгортвання соцспаборніцтва КАМАРЫНСКІ раён дабіўся выканання 40,6 проц. гадавога плана. АРШАНСКІ раён толькі за адну апошнюю пяцідневку арганізаваў здачу дзяржаве больш 13 проц. гадавога плана хлебапаставак, выканаўшы ліпеньскі план на 319 проц.

Аднак, побач з перадавымі раёнамі і калгасамі, мы маем і такія раёны, як ДЗЯРЖЫНСКІ, БЯГОМЛЬСКІ, ЛАГОЙСКІ, СМАЛЯВІЦКІ і інш., якія амаль не прыступілі да арганізацыі хлебапаставак.

У выніку па БССР гадовы план збожжапаставак выканан усяго на 4,7 проц., а ліпеньскі план на 87,5 проц. Гэтыя лічбы паказваюць, што папярэджанне пленума ЦК ВКП(б) усім партыйным і совецкім арганізацыям аб неабходнасці праяўленняў у бягучым годзе антыдзяржаўных тэндэнцый, якія выражаюцца ў затрымцы выканання і нават спробах сарваць дзяржаўныя заданні па хлебапастаўках, не ўсімі раёнамі ўлічана.

Толькі гэтым тлумачыцца тое, што ТУРАЎСКІ раён, які яшчэ на 25 ліпеня зжаў 55 проц. ранніх зернавых і абмалаціў 15 проц. зжатага хлеба, нават не прыступіў да хлебаздачы.

Мы ўжо зараз маем рад фактаў праяўлення антыдзяржаўных тэндэнцый радам калгасаў КРУПСКАГА, і інш. раёнаў, якія, не прыступіўшы да хлебаздачы, намалочаны хлеб раздаюць калгаснікам. Гэтым антыдзяржаўным кулацкім справам яшчэ не даюць належнага адпору кіруючыя раённыя арганізацыі.

Пры агульным адставанні БССР па хлебаздачы асабліва адстае аднаасобны сектар. У большасці раёнаў адсутнічае ўсякая арганізацыйная масава-растлумачальная работа з працоўным аднаасобнікам. Абмалот збожжа па аднаасобнаму сектару не арганізаван, актыўнасць працоўных аднаасобнікаў не мабілізавана на рашуч

У ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЕНЕ ЦКУЮЦЬ БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

Змяшчаемы ніжэй ліст былога чырвонаармейца Чудзеснікава і матэрыялы нашага спецкора гавораць аб абураючым факце цкавання былых чырвонаармейцаў, аб бяздушных адносінах кіраўнікоў раёна да былых камуністаў, якія прышлі з радоў чырвонай арміі. І ўсё гэта ўжываецца з гніла-ліберальнымі адносінамі да кулацкай работы ў калгасах. Як дома, апошні год Лепельскі раён знаходзіцца ў прарыве і ўвесь час трапіць у спісе кандыдатаў на чорную дошку, або раённаў, атрымліваючых папярэджанні.

Друкуемыя ніжэй матэрыялы праліваюць некаторае святло. Раённае кіраўніцтва не ведае калгасаў, не ведае людзей. Яно не бачыць, як у яго пад носам арудуюць кулацкія элементы (мы ўжо друкавалі распандэнцыю аб засмечанасці кадраў загадчыкаў ферм) у калгасах. Вось чаму Лепельскі раён у прарыве.

«Звязда» просіць Парткалегію Камісіі Парткантроля тэрмінова разабраць справу аб цкаванні былых чырвонаармейцаў і строга пакараць бяздушных бюракратаў і сельсоветчыкаў дзяржмордаў.

(ПІСЬМО БЫЛОГА ЧЫРВОНААРМЕЙЦА).

Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай арміі ў кастрычніку 1932 г. я быў кіраван на работу ў калгас імя Дзержынскага, Валасоўскага сельсавета, Лепельскага раёна. У студзені 33 г. мяне абралі старшынёй гэтага калгаса.

Працаваць было цяжка, бо калгасу давалі тых ільгот, якія ён паспеў атрымліваць, як чырвонаармейскі калгас. Матэрыяльныя ўмовы прысланых у калгас чырвонаармейцаў былі надавычай дрэнныя. Асновныя партыйныя і совецкія арганізацыі не ўдзялялі і цяпер не звяляюць гэтаму патрэбнай увагі. Па розных хлуслівых матэрыялах, у калгас імя Дзержынскага, Валасоўскага сельсавета, прыбыла 8 былых чырвонаармейцаў, каб перавярыць адстаючы калгас у перадавы, зрабіць яго чырвонаармейскім калгасам. Зышоўшы з поезда, былыя чырвонаармейцы з'явіліся ў сельсавет. Тамім толькі сказалі, што калгас знаходзіцца ў 28 кілометрах ад горада.

Чырвонаармейцы паехалі, прыбылі да работы. Але работа ў калгасе ішла ўсё-ж дрэнна. Раённыя арганізацыі не аказвалі чырвонаармейцам дапамогі ў рабоце. Нават не растлумачылі ім нармальнае снабжэнне.

У 1932 г., убачыўшы, што калгас імя Дзержынскага не выканаў сваіх абавязкаў перад дзяржавай, раённыя арганізацыі рашылі змяніць кіраўніцтва. Новым кіраўніком калгаса быў пастаўлен комуніст Чудзеснікаў. На іншыя кіруючыя пасады таксама былі пастаўлены дэмабілізаваныя чырвонаармейцы.

Правеўшы змену кіраўніцтва калгаса, раённыя арганізацыі забыліся на тое, што новым людзям трэба дапамагчы. У рэзультаце з 8 чырвонаармейцаў у калгасе асталося толькі тры, астатнія пайшлі хто куды.

Чудзеснікаў часта крытыкаваў трыбуну сельсавета Хамішчанка, колькі разоў аб дзеяннях Хамішчанка заяўляў сакратару райкома Жынкову і старшыні РВК Закоркіну.

Раённыя арганізацыі не палічылі трэбным рэагаваць на гэтыя сігналы, а, наадварот, пачалі цкаваць дзеяснікава і шукаць прычын для выключэння яго з партыі. Да таго-ж адбыўся зручны момант—калгас, кіруемы Чудзеснікавым, своечасова не выканаў плана ільнаадабрання. Хіжынкоў, не праверыўшы, чаму не выканан план, адным росчыркам пяра знімае Чудзеснікава з работы, аддае пад суд і выключае з партыі. Праўда, суд не адбыўся. Пракурор Смірноў не знайшоў падставы для абвінавачвання.

Але гэтага мала. 29 красавіка ад дыпалу нейкага хлапчука ў калгасным гарэлі хлеў. Хто вінават? У раёне рашылі, што вінават Чудзеснікаў. Тады галавацяпы з сельсовета на сабраных на мяне старшынёй сельсовета Хамішчанкам, у студзені Лепельскі райком выключыў мяне з партыі. Знялі з работы і аддалі пад суд. З 30 красавіка па 7 мая мяне трымалі пад вартай у лепельскай міліцыі. За што—не ведаю і да гэтага часу.

Зараз калгас імя Дзержынскага знаходзіцца ў поўразваленым становішчы. Галавацяпам Хамішчанкам і работнікамі МТС распушчаны брыгады ў калгасе, усюды панае абязлічка, старое праўленне распушчана, новае не абрана, калгасам кіруе абы хто. Калгас ідзе да развалу.

ЧУДЗЕСНІКАЎ.

***

ЛЕПЕЛЬ. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Пісьмо тав. Чудзеснікава поўнастаю пацвердзілася.

У калгас імя Дзержынскага, Валасоўскага сельсавета, прыбыла 8 былых чырвонаармейцаў, каб перавярыць адстаючы калгас у перадавы, зрабіць яго чырвонаармейскім калгасам. Зышоўшы з поезда, былыя чырвонаармейцы з'явіліся ў сельсавет. Тамім толькі сказалі, што калгас знаходзіцца ў 28 кілометрах ад горада.

Чырвонаармейцы паехалі, прыбылі да работы. Але работа ў калгасе ішла ўсё-ж дрэнна. Раённыя арганізацыі не аказвалі чырвонаармейцам дапамогі ў рабоце. Нават не растлумачылі ім нармальнае снабжэнне.

У 1932 г., убачыўшы, што калгас імя Дзержынскага не выканаў сваіх абавязкаў перад дзяржавай, раённыя арганізацыі рашылі змяніць кіраўніцтва. Новым кіраўніком калгаса быў пастаўлен комуніст Чудзеснікаў. На іншыя кіруючыя пасады таксама былі пастаўлены дэмабілізаваныя чырвонаармейцы.

Правеўшы змену кіраўніцтва калгаса, раённыя арганізацыі забыліся на тое, што новым людзям трэба дапамагчы. У рэзультаце з 8 чырвонаармейцаў у калгасе асталося толькі тры, астатнія пайшлі хто куды.

Чудзеснікаў часта крытыкаваў трыбуну сельсавета Хамішчанка, колькі разоў аб дзеяннях Хамішчанка заяўляў сакратару райкома Жынкову і старшыні РВК Закоркіну.

Раённыя арганізацыі не палічылі трэбным рэагаваць на гэтыя сігналы, а, наадварот, пачалі цкаваць дзеяснікава і шукаць прычын для выключэння яго з партыі. Да таго-ж адбыўся зручны момант—калгас, кіруемы Чудзеснікавым, своечасова не выканаў плана ільнаадабрання. Хіжынкоў, не праверыўшы, чаму не выканан план, адным росчыркам пяра знімае Чудзеснікава з работы, аддае пад суд і выключае з партыі. Праўда, суд не адбыўся. Пракурор Смірноў не знайшоў падставы для абвінавачвання.

Але гэтага мала. 29 красавіка ад дыпалу нейкага хлапчука ў калгасным гарэлі хлеў. Хто вінават? У раёне рашылі, што вінават Чудзеснікаў. Тады галавацяпы з сельсовета на чале з Хамішчанкам без санкцыі пракурора арыштоўваюць Чудзеснікава. 7 дзён сядзіць Чудзеснікаў, не ведаючы за што і чаму яго арыштавалі.

Рахункаводам у калгасе працуе былы чырвонаармеец—член партыі т. Камароў. Камароў нядаўна прадаў свайго кабана, каб за гэтыя сродкі купіць сабе карову. У гэтым факце самадур Хамішчанка ўгледзеў крымінальнае злачынства. Ноччу разам з міліцыянерам Жураўскім з'яўляецца ён ў кватэру Камарова, адбірае ў яго партыйны білет і арыштоўвае Камарова, як і Чудзеснікава, 8 дзён трымаюць пад вартай, не прад'яўляючы матываў абвінавачвання.

Камароў і Чудзеснікаў жылі ў калгасным доме. Сельсавет выселяе ў хлеў чырвонаармейцаў, а дом перадае МТС. Гэта ў той час, калі ў калгасных дамах жывуць міліцыянер, урач і другія асобы, нічога агульнага з калгасам не маючыя. Кулакі Бадяны, гандляры Крывашэі, якія яшчэ асталіся ў калгасе, з дапамогай старшыні сельсавета Хамішчанка сістэматычна цкуюць былых чырвонаармейцаў за тое, што яны выступаюць супроць злачынстваў, якія ўвесь час творацца ў Валасоўскім сельсавеце.

Аб усіх гэтых здзеках над таварышамі Чудзеснікавым і Камаровым ведаў сакратар райкома партыі Хіжынкоў, старшыня РВК т. Запоркін, ведаў і пракурор тав. Смірноў.

Адсутнасць кіраўніцтва калгасамі з боку раённых арганізацый, сістэматычнае нерэагаванне на пісьмы і сігналы друку ў раёне прывялі да таго, што ў радзе сельсветаў да кіраўніцтва калгасамі прабраліся кулакі і бандыты. У калгасе «Расцвет», Валасоўскага сельсавета, да самага апошняга часу старшынёй быў сын памешчыка Паташонак, які згнаіў 1000 пудоў сена. У калгасе «Ляхавічы», Ляхаўскага сельсавета, 5 брыгадзіраў аказаліся кулакамі і былымі бандытамі, якія і па сённешні дзень астаўлены ў калгасе.

Такіх фактаў можна прывесці даволі многа.

Н. НЕЙДЛІН.

МЕСЯЧНІК абмену вопытам

КАЛГАСНЫХ І БРЫГАДНЫХ ПАРТОРГАЎ

ЯК Я ПРАВОДЖУ РАБОТУ З КАЛГАСНЫМ АКТЫВАМ

МЕЛЬНІКАЎ
парторг калгаса „Актывіст", Аршанскага раёна

Вытворчая нарада калгаснага актыва стала адной з лепшых форм спалучэння вытворчых задач калгаса з разгортваннем масавай работы і прапаганды.

Па спецыяльнаму плану канкрэтна, жыва і дзелавіта праходзяць у нас яны ў калгасе **4-5 раз у месяц.** На нарадзе брыгадзіры і звенняводы дакладваюць, як кожны з іх праводзіць у жыццё сацыялістычныя абавязацельствы і рашэнні вытворчай нарады.

Яшчэ да пачатку ўборачных работ на нарадах мы, напрыклад, вырашалі такія неабходныя справы: выдзелілі спецыяльную брыгаду на малацьбе, адказнага па ільну. На нарадзе мы распрацавалі апаратыўны план уборачнай і давалі штодзённае заданне кожнай брыгадзе і звяну, вызначалі ім участкі работы.

Праведзеная 17 ліпеня вытворчая нарада вырашыла, напрыклад, такія пытанні—вынікі першага дня ўборкі і прапрацоўка даклада таварыша **Сталіна** на XVII партыйным з'ездзе.

Вытворчымі нарадамі мы аб'ядналі вакол праўлення значны актыў, ён у нас з кожным днём расце і зараз налічваецца каля 15 чалавек, а ў мінулым годзе зусім не было актыва, бо ніякай работы з ім не праводзілася. Асабліва рост актыва ідзе за лік жанчын. Жанчыны-актывісткі не дрэнныя арганізатары ўдарнай работы. Так, жляя **МІНАЕВА АНІСЯ** выжынае 0,15 гектара ў дзень, выклікала на соцспаборніцтва **ЖУРАЎКОВУ АКСІННЮ** і **ЖУРАЎКОВУ ВЕРУ,** а яны выпрацоўваюць 0,20 гектара на жніве. Мінаева абавязалася апярэдзіць іх.

Кожная нагрузка, даваемая актывістам, заводзіцца ў спецыяльны дзённік парторга і выкананне заўсёды правяраецца.

Але не толькі вялікая арганізацыйна-масавая работа праводзіцца з актывам. На палях уборкі кожны дзень на перапынках нашы брыгадзіры **ВАХЦЕНКА** і **ПРАКОПЕНКА** выконваюць ролю **брыгадных агітатараў, кожны дзень яны праводзяць чытку газет,** знаёмяць астатніх калгаснікаў з рашэннямі партыі і ўрада. Уся работа парторга падпарадкавана спецыяльнаму месячнаму плану. Гэта дае магчымасць не стыхійна праводзіць партмасавую работу, а заўсёды спыняцца на рашаючых участках, ведаць асноўнае звяно ў рабоце парторга. Работа па згуртаванню актыва забяспечыла ачыстку калгаса ад класавых ворагаў і зараз калгас на ўборцы выходзіць у перадавыя. Ён першым у сельсавеце скончыў уборку ячменю і жыта і да 1-га выканаў абавязацельствы перад дзяржавай па гэтых культурах, а ў пасеўнай ён быў увесь час на чорнай дошцы.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА І УДАРНІЦТВА—У АСНОВУ РАБОТЫ

СЛЕТА
парторг калгаса „На варце" Баўвінаўскага сельсавета, Крычаўскага раёна

Партгрупа нашага калгаса «На варце» складаецца з двух членаў і аднаго кандыдата партыі. Комсамольская арганізацыя—8 чалавек. Калгас наш яднае 210 гаспадарак з 6 населеных пунктаў. Увесь час пасеўнай калгас знаходзіўся ў прарыве па выкананню гаспадарча-палітычных кампаній, але пасля таго, як партгрупа па-сапраўднаму ўзялася за перабудову сваёй работы—поспехі відаць кожнаму—калгас вышаў у перадавыя.

З пачатку сенаўборкі мы расставілі партыйна - комсамольскія сілы па брыгадах. У кожнай брыгадзе вылучан партыйны або комсамольскі арганізатар, які штодзённа знаходзіўся ў брыгадзе, выконвае заданні партыйна-комсамольскай арганізацыі.

Прымяненне індывідуальнай і дробна-групавой здзельшчыны, правядзенне партмасавай работы ў брыгадзе, непасрэдна ў полі, дало свае вынікі. Амаль усе касцы перавыконвалі свае нормы выпрацоўкі 0,33 гектара, даючы па 0,45-0,47 гектара ў дзень.

Да ўборачнай мы падыйшлі з добра абмеркаваным планам. План складаўся самімі ўдарнікамі і ўдарніцамі. І практыка паказала, што наш рабочы план уборкі жыццёвы, выконваецца і перавыконваецца штодзённа, бо яго складалі масы калгаснікаў.

Што ў асноўным забяспечыла поспех уборкі ў гэтым годзе? Першае, гэта шырока разгорнутае соцспаборніцтва паміж брыгадамі, звенямі і асобнымі калгаснікамі. Для ўдарнікаў калгаса складзены лепшыя ўмовы па абслугоўванню. Аванс на працадні ўдарнікі атрымліваюць па асобнаму спісу ў першую чаргу, па так называемаму «Чырвонаму спісу». У сельпо яны маюць свой куток, куды завозяцца лепшыя і больш танныя тавары. Кожнаму ўдарніку выдан ударны білет, па якому ён мае ўсе перавагі ўдарніка. Да пачатку ўборачнай у нас было 56 ударнікаў. За час уборачнай колькасць ударнікаў значна павялічылася, дасягнуўшы 97 чалавек, як'я сістэматычна выконвалі і перавыконвалі нормы выпрацоўкі. Білет ударніка сапраўдны толькі на адзін месяц, на другі месяц сапраўднасць білета працягваецца таму, хто не здаў узятых тэмпаў. Барацьба за ўдарны білет калгаснікі ўзрастае з кожным днём. Нават старая 70 год **ШАЎЦОВА** Волька на агульным сходзе брыгады дала абяцанне, што яна за час жніва атрымае «сіненькую кніжку»—ударны білет. Яна сістэматычна выходзіла на жніво, выконвала поўную норму выпрацоўкі і атрымала білет.

Рашэнні чэрвеньскага пленума ЦК ВКП(б) распрацоўваліся непасрэдна ў брыгадах. Тут-жа калгаснікі-ўдарнікі бралі канкрэтныя самаабавязкі па гадоўлі жывёлы, выкананню плана ўборкі і зернапаставак. Па іх ініцыятыве быў аб'яўлен конкурс на **лепшую жнёю, жняярку і касца.** У чырвоны спіс кандыдатаў, выконваючых умовы конкурса, занесены 78 чал., і спіс кожны дзень павялічваецца.

У час жніва мы кожны дзень выпускалі агульнакалгасны **бюлетэнь і ў брыгадах—насценгазеты.** Бюлютэнь адбіваў ход соцспаборніцтва паміж брыгадамі—хто адстае, хто ідзе ўперадзе. Шмат дапамагае чырвоная і чорная дошка. Так, брыгада № 6 (брыгадзір тав. **КУЛАК**—кандыдат партыі) з першых дзён жніва не выконвала свайго дзённага задання, даючы толькі 80-85 проц. Камісія па спаборніцтву занесла брыгаду на чорную дошку. Брыгада стала набіраць тэмпы і зараз перавыконвае дзённае заданне, даючы па 130-135 проц., за што камісія зняла яе з чорнай дошкі.

Партыйную вучобу мы праводзім зараз акуратна, непасрэдна ў брыгадзе. На заняткох партгрупы заўсёды прысутнічаюць лепшыя ўдарнікі-актывісты. Зараз з гэтага актыва ідзе набор рэзерва кіруючых работнікаў калгаса—брыгадзіраў, загадчыкаў ферм, рахункаводаў, кладаўшчыкоў, трактарыстаў.

БЕСПЕРАШКОДНА РАЗБАЗАРВАЮЦЬ МАЛОЧНУЮ ПРАДУКЦЫЮ

За 1933 год па Рагачоўскай канторы Белмаслапрома было разбазарана шмат малочных прадуктаў: да 540 кгр. сліванчнага масла і некалькі тысяч літраў малака.

Незаконныя выдачы малочных прадуктаў рабіліся з санкцыі кіруючых работнікаў раёна. Непасрэдныя винаўнікі разбазарвання прадуктаў панеслі заслужанае пакаранне. Дырэктар канторы, бухгалтар і іншыя былі прыгавораны судом да розных тэрмінаў зняволення.

Але справа канторы маслапрома нічому не навучыла раённыя арганізацыі.

У Рагачоўскім раёне, як і раней, разбазарваюць малочныя прадукты.

Папярэдняя праверка паказала, што кантора да ліпеня гэтага года не вяла ніякага ўліку паступлення малака. Загадчык прыёмачнай базы **Быхаўскі,** рабочы базы **Кроцікаў** ніякіх запісаў удом малака не рабілі. Ім, як яны самі кажуць, «верылі на слова, як сум лепшым людзям».

Адсутнасць уліку давала поўную магчымасць работнікам канторы разбазарваць малочную прадукцыю, прысвойваць дзяржаўную маёмасць. Дырэктар канторы Заготжывёлы **Зароўскі** на пытанне, колькі штомесячна паступае і расходуецца малака не мог даць выразнага адказу, не мог прадставіць дакладных дакументаў.

Паводле далёка не поўных, прыблізных даных у маі і чэрвені г.г. было выдана рабочым і служачым канторы 720 літраў, адпушчана магазіну райпартактыва 1200 літраў і выдана розным пабочным асобам 1018 літраў.

Хто гэтыя «пабочныя асобы»? Гэта кіруючыя раённыя работнікі, якія без таго штодзённа снабжаюцца малаком праз магазін райпартактыва. За май гг. т. **Васільеў** атрымаў 52 літры, **Зелянкоў**—65 літраў, **Кауфман** — 70 літраў, **Івашчэў** — 50 літраў, **Герчыкаў** 26 і т. д.

Дырэктар т. **Збароўскі** глядзіць на гэтыя агіднасці, як на «нармальнае з'явішча». Ён заяўляе: «У мяне не малочная ферма, даю малако каму хачу».

Пракуратуры трэба зацікавіцца парадкамі ў Рагачоўскай канторы Заготжывёлы.

СВОЙ.

Агляд друку

ЗА ДЗЕЛАВОЕ СПАБОРНІЦТВА

«УДАРНІК КАЛГАСНЫХ ПАЛЁЎ—ГАЗЕТА ПАЛІТАДДЗЕЛА МЕНСКАЙ МТС.

Вельмі многія нашы газеты — і раённыя і палітаддзельскія—шмат шумяць аб соцспаборніцтве. Але «Ударнік калгасных палёў» адносіцца да ліку нямногіх, якія здолелі паставіць спаборніцтва на дзелавую глебу.

«Спаборніцтва патрабуе канкрэтнага плана работы ў кожнай брыгадзе, у кожным звяне, нельга спаборнічаць «наогул», не маючы перад сабой плана дзеянняў. Улік — аснова спаборніцтва» — вось думка, якую ўпарта праводзіць газета на ўсім працягу спаборніцтва брыгад, пачатым у перыяд падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Само спаборніцтва газета разбіла на этапы. Першы **этап** — падрыхтоўка да сяўбы і сяўба. Другі этап — праполка і ўборка.

Закончыўся першы этап — газета падводзіць вынікі, паказвае лепшых і горшых, на вачах ва ўсіх яшчэ раз высвятляе прычыны, чаму лепшыя сталі лепшымі і чаму другія адсталі.

Перадавікі самі расказваюць аб сваім **вопыце** і зноў прапануюць увазе мас свой далейшы план работы — план, які ў той-жа час з'яўляецца планам наступнага этапа спаборніцтва.

Пераможцам у сяўбе вышаў калгас **«Ленінскі шлях»,** а ў ім першае месца заняў брыгадзір **Скорабагаты.** І яму — першаму з першых—дае газета першае слова.

«Добра абдуманы план — першая ўмова поспехаў на ўборцы» — заяўляе брыгадзір усім спаборнічаючым і, падрабязна расказаўшы аб сваім плане ўборкі і разліку з дзяржавай, заклікае іншых брыгадзіраў пачаць падрыхтоўку да ўборкі іменна з распрацоўкі дакладнага і прадуманага плана (№ 48, 4 ліпеня).

Ударнікі друку, «лёгкая кавалерыя», правяраючы спаборнічаючыя брыгады, патрабуюць перш за ўсё прадуманасці і планавасці ў рабоце.

Брыгадзір Паўлюкевіч (3-я брыгада калгаса «Чырвоны будаўнік») адчувае сябе героем напярэдадні ўборачнай. Ён добра справіўся з праполкай і сенаўборкай, машыны да ўборачнай у яго адрамантаваны і чысценькімі стаяць у пуні.

Але [illegible] суровы прыгавор: **«Брыгадзір Паўлюкевіч, твая брыгада не гатова да ўборкі».**

«Машыны адрамантаваны, — гаворыць яна, — але людзі не расстаўлены, звенні да машыны не выдзелены, да ручнога жніва таксама... Памяшканні для складвання снапоў не падрыхтаваны... Брыгадзір не размеціў што куды будзе складвацца. Словам, ніякага плана ў брыгадзіра няма, значыцца брыгада да ўборкі не гатова». (№ ад 4 ліпеня).

Брыгадзіру Паўлюкевічу прыходзіцца тэрмінова прадумаць і разам з калгаснікамі складаць план, прадугледзіўшы ўсе дэталі.

«Ударнік калгасных палёў» добра разумее, што спаборніцтва брыгад не можа выліцца толькі ў спаборніцтва брыгадзіраў. Газета дае канкрэтны план дзеянняў і для звеньевых і для інспектароў па якасці. Перад уборачнай палітаддзел склікае нараду лепшых інспектароў па якасці. Газета разам з імі распрацоўвае канкрэтныя паказальнікі спаборніцтва па кантролю над беражлівай уборкай:

«Дабіцца, каб зернаўлавіцелі былі правільна прыстасаваны, каб перавяслы былі падрыхтаваны загадзя, каб увесь зжаты хлеб за дзень быў да вечара звязан і састаўлен у бабкі» і т. д.

Гэта барацьба за **план работ,** гэта чоткасць у вызначэнні абавязкаў **кожнай групы** людзей дае магчымасць «Ударніку калгасных палёў» паставіць спаборніцтва на дзелавую глебу, зрабіць яго зразумелым і эфектыўным для мас.

Мы бачым, што ў выступленнях на старонках газеты кожны спаборнічаючы — ці то старшыня, брыгадзір або радавы калгаснік — гаворачы аб дасягненнях або недахопах сваёй работы, падыходзіць да іх з пункту гледжання поўных, прадуманых аб'ектаў. Ён не расплываецца ў агульных фразах, бо добра ведае, якое месца яму адведзена ў спаборніцтве і за што ён змагаецца.

У гэтай дзелавой і канкрэтнай пастаноўцы спаборніцтва — вялікая заслуга газеты. Аднак, мы не можам сказаць, што яна ўзорна праводзіць аб'яўлены конкурс брыгад. Вялікі мінус газеты — яе недастатковая аператыўнасць. Газета выходзіць раз у пяцідзеньку, а часамі позніцца і выходзіць раз у дэкаду (№ 22 — 5 чэрвеня і № 23—15 чэрвеня). У прамежак паміж выхадамі газета амаль не прыбягае да спецыяльных выпускаў у экстраных выпадках, як гэта робіць, напрыклад, газета палітаддзела Пялушскай МТС.

Даючы прадуманы, сур'ёзны матэрыял па спаборніцтву, газета гартуе такімі масавымі аператыўнымі формамі работы, як вядзенне **чырвонай і чорнай дошак,** аператыўнай зводкі, якія даюць магчымасць у сцісла[illegible] на сапастаўляць паказальнікі работы калгасаў, брыгад, звеньняў і т. д. Друкуючы абавязацельствы таго або іншага спаборнічаючага, газета часта забывае праверыць, як ён выконвае свае абавязацельствы.

У нумары ад 1 красавіка брыгадзір Міхалоўскі, гаворачы аб недахопах сваёй работы, заявіў, напрыклад: «Далёка адстала мая брыгада, але яна будзе перадавой». Заява цікавая. Але што вынла з гэтай заявы Міхалоўскага — невядома.

Усе гэтыя недахопы трэба ўлічыць і выправіць.

ПАДРЫХТАВАЦЬ ПРЫГОЖЫ І УТУЛЬНЫ ШКОЛЬНЫ БУДЫНАК

АГЛЯД РАБСЕЛЬКОРАЎСКІХ ПІСЕМ

Школьная сетка ў Совецкай Беларусі расце з года ў год. Мы ажыцвілі ўсенавуч за пачатковую школу, ажыццяўляем усеагульнае абавязковае навучанне за няпоўную сярэднюю школу. Усё гэта патрабуе значнага пашырэння школьнай плошчы. І таму зусім аразумела, што асноўным з асноўных і рашаючых моментаў у падрыхтоўцы да новага навучальнага года з'яўляецца **сканчанне новага будаўніцтва.** Але ў раёнаў партыйныя арганізацыі і совецкія органы дагэтуль лічаць буйніцтва школ другараднай справай. І, як вынік, школьны будынак у нас пярэдка будуюць два-тры і чакаюць пяць год.

У вёсцы Шыічы, Суханавіцкага сельсавета (Мазырскі раён), двухпалёсная школа «будуецца» з 29 года. І сёлета не толькі не прыняты меры да сканчэння пабудовы, але наогул будаўнічыя работы спынены,—піша селькор **Уласенка.** Такое-ж становішча з будаўніцтвам школы для **Брагінскай** няпоўнай сярэдняй школы. Яна таксама,—паведамляе тав. **Іофе,**—будуецца чатырыгодны. Узведзеныя ўжо сцены пачынаюць гніць, гніе загатоўлены матэрыял.

Асабліва ганебныя справы з будаўніцтвам у **Крычаўскім** раёне. Будынак для **зарубецкай** школы,—паведамляе нам уласны карэспандэнт **Вішнеўскі,**— будуецца пяць год. За гэтыя гады здолелі паклаць усяго 4 вянкі сцен. Загатоўленыя матэрыялы расцягваюцца. А старшыня сельсовета **Сакалоў** проста заяўляе: «Няхай другія будуюць, а я будаваць не буду»... У **Маляцкім** сельсавеце (старшыня **Рапіловіч**) у трох новых будынках засталося зрабіць невялікія ўнутраныя работы і школы можна было-б здаць у эксплуатацыю, але гэтых работ нават і не пачынаюць.

Не лепшае становішча з будаўніцтвам і ў **Смалявіцкім** раёне. У мясцовасці Смалявічы на вачах раённых арганізацый ужо чатыры гады «будуецца» школа і канца гэтаму будаўніцтву не відаць. Смалявіцкі калгас (загадчык **Лазарчык**) справу вядзе да таго, што падмурак будынка пачаў разбурацца, сцены скрывіліся, разбураецца дах. І, як не дзіўна, у Смалявічах ніхто яшчэ з гора-будаўнікоў не аддан пад суд. (З пісьма селькора **Н. А.**).

Не менш важным, чым сканчэнне будаўніцтва новых школ, з'яўляецца **рамонт школьных памяшканняў.** Мы маем усе ўмовы і абавязаны зрабіць так, каб вучань, прыйшоўшы ў школу, **знайшоў школьнае памяшканне добра адрамантаваным, прыгожым і утульным.** Між тым, факты гавораць, што не па ўсіх раёнах рамонту школьных памяшканняў адводзіцца належная ўвага. З **Смалявіцкага** раёна піша нам селькор **Н. А.**: «Аб рамонце пачатковых школ раёна і гаварыць няма чаго,—аб ім не думае ні Камгас, ні раённы аддзел нарасветы». Будынак **Крупскай** чыгуначнай няпоўнай сярэдняй школы патрабуе значнага рамонту: дах працякае, падлога ў многіх класах папсавалася, печы развальваюцца. Дырэктар школы тав. **Еўсеева** амаль штодня ходзіць да загадчыка Крупскага райана **Баканава** з просьбай аказаць практычную дапамогу ў рамонце, але акрамя абяцанак нічога не атрымлівае. Не клапоціцца аб гэтай школе і адміністрацыя чыгункі (з пісьма селькора **Дзімітрыева**).

Гэта не сакрэт, што нашы школы ў шмат якіх мясцах перапоўнены да адказу, у лепшым выпадку заняткі праводзяцца ў дзве змены. І ў гэты час у школьных памяшканнях усё яшчэ жывуць прыватныя жыхары; многа былых школьных будынкаў занята іншымі ўстановамі і арганізацыямі. Напрыклад, у Гомелі для новага набору не хапае 24 класных пакояў, а 7 былых школьных будынкаў заняты прыватнымі жыхарамі і рознымі ўстановамі. У Рэчыцы такі-ж самы малюнак. **Група настаўнікаў** піша ў «Звязду»: «Рэчыцкі райвыканком у свой час вынес пастанову аб перадачы школам да 25 чэрвеня ўсіх былых школьных будынкаў. Прайшло больш месяца, а прыватныя жыхары са школы ўсё яшчэ не выселены».

Паспяховае ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага навучання за няпоўную сярэднюю школу ў сельскіх мясцовасцях патрабуе стварэння ўмоў для таго, каб дзеці з далёкіх калгасаў і вёсак маглі акуратна наведваць заняткі. Для гэтага неабходна прывесці ў парадак **інтэрнаты,** скарыстаць пад іх былыя кулацкія дамы. **Кабаноўскі-ж** сельсавет, Жлобінскага раёна, уключаючыся ў конкурс на лепшую падрыхтоўку да новага навучальнага года, пастанавіў выключыць з дагаворнага пункт аб пабудове інтэрната на той прычыне, што «яго, моў, нельга выканаць». Між тым, у межах сельсавета ёсць дастаткова былых кулацкіх дамоў, якія можна было-б лёгка прыстасаваць пад інтэрнат і тым самым забяспечыць поўны ахоп дзяцей школай. (З пісьма тт. **Баравіка** і **Савіцкага**).

Зразумела, не ўсюды так дрэнна стаіць справа з падрыхтоўкай да новага навучальнага года. Напрыклад, Улукаўскі сельсавет, Гомельскага раёна,—як паведамляе тав. **Эдэльштэйн,—ужо адрамантаваў усе школьныя будынкі, пабудаваў дом для кватэр настаўнікаў, забяспечыў школы навучальнымі прыладамі.**

Можна прывесці яшчэ рад фактаў, калі сельсоветы, уключыўшыся ў конкурс, па-баявому ўзяліся за падрыхтоўку да навучальнага года. Напрыклад, у Гіжэнскім сельсавеце, Прапойскага раёна (старшыня тав. Пашэснік), звыш плана перавозіцца будынак для няпоўнай сярэдняй школы, дзве школы ўжо адрамантаваны, школам падвезен апал на цэлы год.

Прыклад перадавых сельсветаў сведчыць аб тым, што пры большэвіцкай ініцыятыве і напорыстасці можна задоўга да пачатку заняткаў падрыхтаваць школы так, каб было забяспечана добраякаснае навучанне дзяцей. Райкомы партыі абавязаны, забяспечыць своечасовую падрыхтоўку прыгожых і утульных школьных будынкаў.

ЗАМАЦАВАЦЬ АСНОЎНЫЯ КАДРЫ У СОЎГАСАХ

АРХІПАЎ начпалітаддзела соўгаса „Кукцічы"

Не прыходзіцца даказваць, як важна і неабходна спыніць цякучасць рабочай сілы ў нашых соўгасах, замацаваць асноўныя кадры рабочых, стварыць для вядучых прафесій і старых рабочых-ударнікаў рад пераваг. Указанні т. **Сталіна** па гэтых пытаннях агульнавядомы.

Не прыходзіцца адначасова даказваць, што барацьба супроць цякучасці ў нас у вельмі многіх і многіх соўгасах амаль не вялецца, што цякучасць з'яўляецца сапраўдным бічом для соўгасаў, адной з прычын адставання соўгасаў, перашкодай на шляху да рэнтабельнасці.

Галоўным сродкам для замацавання асноўных кадраў з'яўляецца паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых, стварэнне ільгот і пераваг для старых рабочых і вядучых прафесій.

Пачын завода імя **Авіяхіма** ў Маскве, паставіўшага канкрэтна пытанне аб перавагах і ільготах для старых рабочых-ударнікаў, узаконіўшага гэтыя ільготы шляхам уключэння ў калдагавор («Правда» 18-га мая) паказвае шлях для нашых соўгасаў, як трэба змагацца за замацаванне кадраў. Соўгасы маюць не менш магчымасці, чым заводы для стварэння ільгот і пераваг старым рабочым і вядучай прафесіі.

Свінасоўгас **«Кукцічы»** — адзін з рэнтабельных соўгасаў у БССР — тут цякучасць нязначная. Але цякучасць усё-ж хоць і невялікая ёсць, асабліва на свінаферме, куды людзі ідуць працаваць менш ахотна, чым у іншыя цэхі соўгаса. Калі ў зернасоўгасах асноўная фігура гэта трактарыст і камбайнёр, то ў свінасоўгасе — гэта свінар...

Па ініцыятыве палітаддзела дырэкцыя і рабочком устанавілі наступныя перавагі для працуючых на свінаферме:

Выдача крупы, бульбы, гародніны і фруктаў, адпускаемых па нормах, праводзіцца для ўдарнікаў-свінароў на 30 проц. і не-ўдарнікаў на 10 проц. больш у параўнанні з рабочымі іншых цэхаў.

Выдача дэфіцытных прамтавараў праводзіцца для ўдарнікаў на 50 проц. і не-ўдарнікаў на 20 проц. больш у параўнанні з рабочымі іншых цэхаў.

Падвоз дроў і прадстаўленне жыллаплошчы ў першую чаргу працуючым на ферме.

Гэтыя мерапрыемствы, не на словах, а на справе стваралі перавагу для асноўнай прафесіі ў свінаводчым соўгасе, канчаткова ліквідуюць цякучасць і дапамогуць стварыць устойлівыя кадры работнікаў на гэтым важнейшым участку.

Для рабочых, працуючых звыш пяці год у соўгасе, складаючых касцяк соўгаса, мы ўстанавілі наступныя перавагі:

У адносінах апалу і кватэр яны прыроўнены да вядучай прафесіі, хоць-бы працавалі ў іншых цэхах.

Чарговы адпачынак ім павялічваецца за 5 год работы ў соўгасе на 2 дні і за кожныя тры гады звыш 5 год—яшчэ на 1 дзень. Такім чынам, стары рабочы, працуючы ў соўгасе 8 год, атрымлівае тры дні дадаткова адпачынку.

Дырэкцыя асігнуе грашовыя сродкі для першачарговага авансавання старых рабочых на пакупку кароў і дробнай жывёлы.

На ўсе платныя відовішчы ў клубе для іх уводзіцца 50 проц. скідкі.

Вытворча - таварыскаму суду прадстаўляецца права падбіваць гэтых прывілегій на тэрмін да аднаго месяца.

Асобы, занесеныя на чорную дошку, за ўвесь час знаходжання на чорнай дошцы гэтымі ільготамі не карыстаюцца.

Без тэхнічных навыкаў, канкрэтных ведаў і знаёмства з абстаноўкай данага соўгаса, якімі ўладаў-бы кожны рабочы, нельга дабіцца выканання задач, пастаўленых XVII з'ездам партыі.

Без ведання зоаветмінімума не захаваеш маладняка; калі ферма будзе прахадным двором, нельга арганізаваць вывучэння гэтага зоаветмінімума. Калі стары рабочы-ўдарнік абслугоўваецца таксама, як толькі што прышоўшы, няма стымула для замацавання на рабоце — не стварыць пастаянных кадраў.

Калі новы рабочы, прыходзячы ў соўгас бачыць ільготы і перавагі для старых рабочых і для вядучай прафесіі, ён сур'ёзна і надоўга застанецца ў соўгасе, каб стаць ударнікам, бо ведае, што па меры павелічэння стажу ён будзе набываць ільготы і перавагі і прац

ТОЛЬКІ МАБІЛІЗУЮЧЫ РЭВОЛЮЦЫЙНУЮ ПІЛЬНАСЦЬ МАС, ТАЛАЧЫНСКІ РАЁН МОЖА ВЫЙСЦІ З ПРАРЫВА

Ніжэй мы змяшчаем вытрымкі з пастановы бюро Талачынскага РК КП(б)Б па матэрыялах «Звязды»: «У Талачынскім раёне няма рэволюцыйнай пільнасці» (2 пісьмы аб засмечанасці калгасаў і матэрыял нашага карэспандэнта). З матэрыялаў гэтых выцякае бясспрэчны вывад: кіраўніцтва раёна не разумее і не праводзіць на справе позынга партыі аб крытыцы і САМАКРЫТЫЦЫ.

Іменна таму райком і яго газета спачатку на працягу двух тыдняў упарта сабатавалі матэрыялы «Звязды», а пазней, прытёршы заднім чыслом далёка не выдатным выступленнем ад 22 ліпеня, райком выдаў «Звяздой», даўжэзную рэзалюцыю.

Праўда, некаторых віноўнікаў (яўных кулакоў)—Маслоўскага, Ступака і іншых выключылі з партыі, а пакараць комуністаў, патураючых дзеянням кулакоў, аба раняючых іх—Баркоўскага і Удалага—у райкома не хапіла мужнасці. Замаўчаў райком і аб фактах ігнаравання радам раённых арганізацый пісем і скарг працоўных.

І САМАЯ ЦЯЖКАЯ ПАМЫЛКА ТАЛАЧЫНСКАГА КІРАЎНІЦТВА Ў ТЫМ, ШТО ЯНО НЕ ЗДОЛЕЛА І НЕ ЗАХАЦЕЛА МАТЭРЫЯЛЫ «ЗВЯЗДЫ» СКАРЫСТАЦЬ ДЛЯ МАБІЛІЗАЦЫІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ І МАСЫ КАЛГАСНІКАЎ НА БАРАЦЬБУ З ПРАНІКШЫМ У КАЛГАСЫ КУЛАЦКІМ АХВОСЦЕМ, НА АЧЫСТКУ КАЛГАСАЎ АД КУЛАЦКАГА СМЕЦЦЯ. Пацвярджэнне гэтага — пісьмы, якія мы сёння друкуем.

«Звязда» лічыць, што новае кіраўніцтва Талачынскага РК павінна неадкладна выправіць гэтыя грубыя палітычныя памылкі.

ЗАСІПЛЕ МАЛІВАНАВЫХ

(ПІСЬМО БЫЛЫХ ЧЫРВОНАГВАРДЗЕЙЦАЎ)

Мы шмат пісалі аб агітпрацоях, што творацца ў нашым калгасе «Беларуская вёска», Талачынскага раёна. Пісалі ў палітаддзел МТС, райгазету, РВК і ні адкуль не атрымалі адказу. І вось нарэшце мы звяртаемся за дапамогай у «Звязду».

Справа вось у чым. У нашым калгасе на ўсе галоўныя пасады прабраліся Маліванавы, або іх блізкія прыяцелі і «правяць» калгасам, як ім хочацца.

Яны бяруць для сябе авансы мукою, збожжам і чым папала і спекулююць гэтым дабром. У той-жа час ёсць калгаснікі, якія маюць крайнюю патрэбу ў хлебе, але Маліванавы ім нічога не даюць.

Маліванаў Д. (рахункавод) распараджаецца калгаснымі прапыма, як толькі яму ўздумаецца. Ён ездзіць у Маскву да брата і там па небывала высокіх цэнах дастае цвікі. Мы ўпэўнены, што на гэтых «аперацыях» Маліванаў мае добрыя «процанты» ў сваю кішэню. Гэты-ж самы Маліванаў даў прытулак у калгасе сыну раскулачанага кулака Драздова.

Парторгам калгаса працуе таксама Маліванаў — брат рахункавода. Ён усякімі захадамі прыкрывае злачынную дзейнасць сваёй кампаніі.

Старшыня калгаса **Балабуеў** пад уплывам Маліванавых праводзіць іх «лінію».

У калгасе разбазарваюцца працадні. Праўленцы 3 дні кірмашавалі на «Ятора», а за кожны прагуляны дзень запісвалі сабе ў табель па 1,5—1,75 працадня.

МАЗАК М., ДАРАФЕЎ.

РАЙЗА ПАТУРАЕ ЗЛАЧЫНСТВАМ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Былыя кіраўнікі нашага калгаса імя 16 партз'езда, Слаўнаўскага сельсавета, Талачынскага раёна,—старшыня **Нарбін Рыгор**, рахункавод **Матковіч П.** і кладаўшчык **Матковіч С.** — пастараліся па-больш «запкодзіць калгасу і набіць уласныя кішэні.

Яны за паўлітра гарэлкі раздавалі лепшую калгасную зямлю пад пасеў тым калгаснікам, якія і так мелі вялікія сядзібы. Нарбін таксама і сябе надзяліў добрым кавалкам агароду.

Нарбін цэлую зіму даіў для сябе абагуленую карову.

Гэта шайка зганяла 200 пудоў калгаснай бульбы. Нарбін і К° бескантрольна бралі для сябе насенную бульбу, а потым вывозілі на базар для спекуляцыі.

Калгаснікі, убачыўшы куды вядзе іх Нарбін, знялі яго з работы і выключылі з калгаса. Таксама выключылі і яго памочнікаў Машковічаў. Справу-ж аб іх злачынствах перадалі ў Талачынскае райсуд.

Гэта было ў пачатку мая месяца. З таго часу прайшло тры месяцы, а мы не ведаем, што думае прадпрыняць райсуд. А тым часам злачынцы п'янствуюць за наша дабро і насмейваюцца над калгаснікамі.

Дакуль-жа райсуд будзе патураць злачынцам і зладзеям?

ЛАТУШКІН.

ВЫМУШАНАЕ І НЯПОЎНАЕ ПРЫЗНАННЕ

ТАЛОЧЫН. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Нарэшце пасля амаль трохтыднёвага маўчання загаварыў Талачынскі райком КП(б)Б. У адказ на матэрыял «Звязды», змешчаны ў нумары за 5 ліпеня 1934 года, «У Талачынскім раёне няма рэволюцыйнай пільнасці» вынесена пастанова і, за подпісам нам, сакратара райкома ВАНСБОРДА, змешчана ў райгазеце «Калгаснік Талачыншчыны». Пастанова займае цэлую старонку газеты. Так што наконт колькасці пісаніны папракнуць райком не прыходзіцца.

Аднак, чым-жа тлумачыць доўгае маўчанне райкома?

Дамо слова самаму Ванборду.

— Мы былі вылучылі камісію, — кажа намеснік сакратара,—потым, калі камісія закончыла расследванне, мяне выклікалі на пленум ЦК і разбор справы прышлося адкласці, а потым аказалася, што яшчэ не сабран увесь матэрыял і справу зноў прышлося адкласці.

Аднак, сапраўднасць паказвае, што верыць Венсборду няварта. Папершае пастанову райком вынес толькі пасля таго, як у «Звяздзе» было надрукавана: «З апошняй пошты»—«Падазронае маўчанне».

Па-другое, Пастанова датавана 22 ліпеня, у той час, калі яна фактычна вынесена 24 ліпеня.

Вывад: райком КП(б)Б не турбаваўся аб своечасовым рэагаванні на сігналы газеты і вынес сваю пастанову выключна пад напорам «Звязды». Імкнучыся зменшыць сваю віну, райком ужыў нядобрасумленную махінацыю датамі.

А зараз па сутнасці самой пастановы. Ці адпавядае яна сур'ёзнасці матэрыялаў «Звязды»?

Райком КП(б)Б не схілен браць на сябе віну за прытуленне рэволюцыйнай пільнасці. Ён лічыць, што ўсе агідпасці маюцца толькі таму, што было «ПРЫТУЛЕННЕ КЛАСАВАЙ ПІЛЬНАСЦІ, ПРАМОЕ ЗРОШЧВАННЕ З КУЛАЦКА-ШКОДНЫМІ ЭЛЕМЕНТАМІ ЯК З БОКУ АСОБНЫХ РАБОТНІКАЎ СЕЛЬСОВЕТАЎ, ТАК І НЕКАТОРЫХ КІРУЮЧЫХ РАЁННЫХ РАБОТНІКАЎ.

Цікава параўнаць вызначэнне віны («прамое зрошчванне з кулацка-шкодным элементам») і вывад у адносінах суддзі БАРКОЎСКАГА і райпракурора УДАЛАГА, якія «сталі на шлях абароны кулакоў, яны заслугоўваюць суровага партыйнага пакарання, але ўлічваючы...» і т. д. і т. д. «Удалага і Баркоўскага папярэдзіць...».

Райкомаўскае «папярэджанне» не пашло на карысць. З таго часу, як «Звязда» выкрыла шкодніцкую дзейнасць кулакоў-бандытаў Лемяшовых і Крышана, праходзіць месяц. Аднак ні Удалы, ні Баркоўскі да гэтага часу «не здолелі» прыцягнуць кулакоў да адказнасці. У рэдакцыю райгазеты зноў паступаюць пісьмы селькораў аб тым, што Лемяшовы па-ранейшаму арудуюць у Плоскім сельсавеце.

Як бачым канцы тут не вяжуцца. Тут нешта перашкаджае раённым кіруючым органам дзейнічаць хутка і вычарпальна.

У пастанове райкома значыцца, што матэрыялы «Звязды» будуць прапрацаваны «на правядзіных 23 ліпеня куставых партсходах». Гэта ў той час, калі сама пастанова была вынесена толькі 24 ліпеня і 25 ліпеня змешчана ў райгазеце.

Зноў «няўвязка»!

Райгазета «Калгаснік Талачыншчыны» не перадрукавала матэрыялаў «Звязды» і да сёнешняга дня. Райком абавязаў рэдакцыю змясціць толькі матэрыял «Звязды» ад 22 ліпеня—«Падазронае маўчанне».

Усё гэта відавочна паказвае, як Талачынскі райком КП(б)Б не жадае па-большэвіцку паставіць пытанне, «абараняецца» фармальнымі пастановамі, мэта якіх—«адвесці вочы». У рэзультаце—кулацкая работа не спыняецца. Гэта відаць з друкуемых сёння, праверaных намі, пісем селькораў аб калгасах «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА» і імя 16 ПАРТЗ'ЕЗДА. Прычым, гэта работа праводзіцца пры яўным папусціцельстве раённых арганізацый.

Ці патрэбна яшчэ больш фактаў і доказаў аб тым, што Талачынскія кіраўнікі страцілі большэвіцкі твар і не жадаюць па-сапраўднаму ўзяцца за вывад раёна з ганебных прарываў?

П. ЧЫКУН.

З пастановы бюро Талачынскага РК КП(б)Б ад 22 ліпеня 1934 г. па артыкулу „У Талачынскім раёне няма рэволюцыйнай пільнасці"

Бюро РК адзначае, што факты, выкладзеныя ў артыкуле «Звязды» поўнасцю пацвердзіліся. Гэта ёсць—піхаюцца далей у пастанове—рэзультат прытуплення класавай пільнасці, прамой сувязі з класава-варожымі элементамі з боку работнікаў сельсавета і некаторых кіруючых раённых работнікаў (каго, якіх работнікаў?—рэд) у рэзультаце адсутнасці разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Бюро РК пастанавіла: члена партыі Маслоўскага і кандыдата партыі Ступака за сістэматычнае патураннe кулацкім элементам, укрыццё іх ад індывідуальнага абкладання, выключыць з радоў партыі.

За праўленне палітычнай слепатой і абарону кулакоў райпракурора Удалы і нарсуддзя Баркоўскі заслугоўваюць суровага партыйнага спагнання. Але ўлічваючы іх шчырае прызнанне і асуджэнне зробленых імі памылак тт. Удалага і Баркоўскага папярэдзіць (якая суровасць!—рэд.), абавязаўшы ў далейшым больш праяўляць рэволюцыйную пільнасць.

Адначасова прапанаваць тав. Удаламу правесці паказальны працэс над кулакамі вёскі Габрылава—Лемяшовымі, Крышыным, Кажамякіным і інш.

Абавязаць пракурора тав. Удалага закончыць справу і правесці паказальны працэс па фактах антысемітызма ў калгасе імя 1 мая, Новасельскага сельсавета. Парторга гэтага калгаса **Губіна** за сістэматычнае п'янства і садзейнічанне праяўленню антысемітызма—**з партыі выключыць.**

Загадчыку райана тав. **Ушакову** за няправільную інфармацыю бюро РК аб тым, што настаўніца **Перавозніка**ва, як дачка кулака, знята з работы — **абвясціць суровую вымову.**

Бюро РК КП(б)Б прызнае сваю памылку ў тым, што справа па разгляду гэтага артыкула вельмі зацягнулася. Адзначыць палітычную слепату райгазеты «Калгаснік Талачыншчыны» ў тым, што яна на сваіх старонках не змясціла матэрыялаў «Звязды».

Прапанаваць ЧВА рэдактару Бельцэру выправіць дапушчаныя памылкі, змясціўшы артыкул «Звязды» ад 22 ліпеня (чаму толькі ад 22, а не і ад 3 ліпеня?—рэд.) і даць разгорнутую самакрытычную перадавіцу па гэтаму пытанню.

Гэту пастанову распрацаваць на правалзімых 23 ліпеня куставых партсходах.

Нам. сакратара РК КП(б)Б ВАНСБОРД.

ДА ГАДАВІНЫ АДКРЫЦЦЯ БЕЛАМОРСКА-БАЛТЫЙСКАГА КАНАЛА

Год назад, 2 жніўня 1933 г. быў урачыста адкрыт Беламорска-Балтыйскі канал.

На здымку: першы параход «СЕВАСТОПАЛЬ» праходзіць апошні шлюз канала ля выхаду ў Белае мора.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

ПРАКУРОРУ РЭСПУБЛІКІ ТАВ. КУЗЬМІНУ.

БЕЛЖЫЛСАЮЗ РАЗБУРАЕ ЖЫЛЫЯ ДАМЫ

(ПІСЬМО ЖЫЛЬЦОЎ).

Дом № 13-а (Бранявы завулак), пабудаваны Белжылсаюзам тры гады таму назад, пачаў разбурацца. Штукатурка са столі падае на галовы жыхарам, пліты ў зімовы час дымяць, трубы вадаправодаў лопаюцца, страха працякае, ад чаго ў часе дажджу ў кватэрах не знойдзеш сухога месца. Зімой у кватэрах халадэча, ад якой памяшканне псуецца і людзі пакутуюць. І ўсё гэта таму, што кіраўнікі Белжылсаюза не паклапаціліся закончыць цэнтральнага апаплення.

Мы неаднаразова ставілі пытанне перад праўленнем Белжылсаюза аб рамонце дома. У адказ на гэта было ўхвалена скласці каштарыс і пачаць рамонт. Праз некаторы час у Белжылсаюзе перадумалі і рашылі дом гэты перадаць жыллёвай кааперацыі «Комінтэрн». Але і гэтага рашэння таксама не давялі да канца. Дом і да гэтага часу не перададзены.

Кіраўнік будаўніча - рамонтнай канторы Горжылсаюза тав. Адзінцоў сам разбурае дом. Ім разбураны вапны пакой, а вапна выкінута ў хлеў.

Прадстаўнікі жыллёва-будаўнічага таварыства «Комінтэрн» кожны дзень ходзяць у Белжылсаюз, каб аформіць перадачу дома, а там усё раяць: «Прыходзьце заўтра».

Такім чынам Белжылсаюз сам свядома на працягу 3 год разбурае жылы дом і здзекуецца над жыхарамі.

ЕВЕЛЕЎСКІ, ГЕРЧЫКАЎ.

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА АРШАНСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ ЭКСПЛААТАЦЫІ МБВ ЧЫГ. ТАВ. КІРЫЛАВУ.

У ОРШЫ НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ КУЛЬТУРНЫМ АБСЛУГОЎВАННІ ПАСАЖЫРАЎ

(ПІСЬМО ПАСАЖЫРА).

Орша — вузлавая станцыя. Праз яе праязджаюць тысячы пасажыраў. Многім прыходзіцца рабіць перасадкі і чакаць патрэбнага поезда па 7-8 і больш гадзін. Але кіраўніцтва станцыі не паклапацілася аб тым, каб скласці адпаведныя ўмовы для пасажыраў.

На станцыі няма ўмывальніка, буфет не працуе. Прыбіральня далёка ад вакзала і трымаецца ў самым антысанітарным становішчы. Аб культурным абслугоўванні пасажыраў і гаварыць нявартa.

А. М. ПЕЎЗНЕР.

САКРАТАРУ ПАРТКОМА УЭА Т. КЛЕЙНУ.

ШЭСЦЬ МЕСЯЦАЎ ПР ВОДЗЯЦЬ ЭЛЕКТРАПРАВОДКУ

(ПІСЬМО РАБОТНІЦЫ).

З пачатку лютага м-ца гэтага года мне, як ударніцы, заўком швейнай фабрыкі імя **Крупскай** даў дазвол на электраправодку ў маю кватэру. Праводку павінна зрабіць Менскае аддзяленне Усесаюзнага электрааб'яднання (УЭА).

Кожны дзень я хаджу ў УЭА і кожны раз атрымліваю адзін і той-жа адказ: «Праз два дні к вам прыдуць, склануць каштарыс і зробяць праводку».

Прайшло не два дні, а шэсць месяцаў, а электраўвод у маёй кватэры так і не зрабілі.

Б. РАКОЎСКАЯ.

ПРАКУРОРУ ПОЛАЦКАГА РАЁНА Т. ГІНЗБУРГУ.

АШУКВАЮЦЬ ПАКУПНІКОЎ

(ПІСЬМО ПАЙШЧЫКА).

Полацкім аддзяленні Белгандля заселі былыя гандляры, жулікі і спекулянты, якія і цяпер маюць цесную сувязь з перакупшчыкамі.

Загадчык крамы **Шалман** атрымліваемыя ім для крамы тавары раздае сваім знаёмым. Спекулянту **Ехілеўскаму** ім выдана больш 180 метраў мануфактуры.

Цукеркі, атрыманыя для прадажы па цвёрдых цэнах, Шалман змешваў з камерцыйнымі і прадаваў па 14 руб. 50 кап. кілограм. Цукар раздае сваім знаёмым. Трыфіцку адпусціў 16 кгр., Раманоўскаму 8 кгр., Тумашэнку 4 кілограмы.

Загадчык другой крамы Трыфіцік самаўласна павышае цэны. Касцюмы каштоўнасцю ў 100 руб. 25 кап. Трыфіцік прадае па 106 руб. і т. д.

Аб усім гэтым было заяўлена ў раймілыцыю, але міліцыянер **Шаркевіч**, якому было даручана расследванне, справу змазаў.

Ведае аб гэтым і райснаб, а мер чамусці ніякіх не прымае.

ПРАТОСЕЎ.

МОЛАТАЎЦЫ НЕ СТРЫМАЛІ СВАЙГО АБЯЦАННЯ

(ПІСЬМО РАБОЧЫХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ).

Рабочыя завода імя **Молатава** ў парадку шэфства да дня вызвалення Беларусі ад белапалякаў узяліся адрамантаваць сталоўку грузчыкаў ст. Менск. Абяцанне застаўлося пустой размовай. Сталоўка і зараз зачынена. Праўда, молатаўцы распачалі было работу, перакладзілі падлогу, а далей работа спынілася.

У рэзультаце рабочыя-грузчыкі і цяпер вымушаны хадзіць па чужых сталовых, што дрэнна адбіваецца на выкананні плана пагрузкі.

НЯХАЙЧЫК, ШЫЛАЎ, ШЛЯХЦЕНКА, ГІНЗБУРГ.

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКОМСУВЯЗІ ТАВ. ВАЛОДЗЬКА.

ТЭЛЕГРАМУ ВЕЗЛІ НА ВАЛАХ...

(ПІСЬМО ХВОРАГА)

Пасля аперацыі я павінен быў паехаць на папраўку да сваіх родных у Талачынскі раён.

20 ліпеня я аб гэтым паведаміў іх тэлеграмай: «Выязджаю 21 ліпеня, сустракайце».

Прыехаў я на станцыю Талочына, а родных не аказалася. Такім чынам я вымушан быў пасля аперацыі ісці 12 кілометраў пехатой. Прыйшоў дамоў, а тэлеграмы маёй яшчэ няма. Прыбыла тэлеграма толькі праз тры дні.

Такая работа пошты ёсць здзекі над працоўнымі.

ДЗЕРАНЧОЎСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ: Скаргаў на дрэнную работу апарата сувязі рэдакцыя атрымлівае многа. Усе яны сведчаць аб адным — нячулых, бюракратычных адносінах да працоўных з боку рада работнікаў апарата сувязі.

Упаўнаважанаму Наркамата сувязі патрэбна заняцца ачысткай свайго апарата ад непатрэбных там людзей.

«Звязда» чакае ад тав. Валодзька тэрміновага расследвання факта з затрымкай тэлеграмы тав. Дзеранчоўскага і прыцягнення вінаватых да суровай адказнасці.

ПА СЛЯДАХ ПІСЕМ

ДЗЕ-Ж ТУТ КЛАСАВАЯ ПІЛЬНАСЦЬ?"

Змешчаны ў «Звяздзе» 17 ліпеня артыкул «Дзе-ж тут класавая пільнасць?» 20 ліпеня абгаворан на бюро Быхаўскага РК КП(б)Б.

Крытыка «Звязды» прызнана зусім правільнай. Старшыня і сакратар Чачэвіцкага сельсовета з работы зняты.

Для наладжвання ўліку працадзён і прыняцця мер па аздараўленню калгаса імя **Сталіна** накіраван т. Кучараў. Пытанне аб арцелі «Ударны лесаруб» будзе абгаворана асобна.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Настаўнік т. **Суравіцкі** (Бярвенскі сельсавет, Уваравіцкага раёна) пісаў у рэдакцыю «Звязды», што настаўнікі два месяцы не атрымлівалі зарплаты.

Увальскае сельпо настаўнікам не выдае пайкоў.

Старшыня Уваравіцкага РВК паведамляе, што за невыплату пенсіі настаўнікам старшыня Бярвенскага сельсовета з работы **знят.** Зарплата настаўнікам выплачана.

За невыдачу пайка настаўнікам старшыня сельпо Васількоў аддадзен пад суд.

Селькор Дуброўскага сельсовета, Церахаўскага раёна «Н.» пісаў, што праўленне калгаса «Чырвоны Бор» засмечана кулацкімі элементамі.

Пракурор Церахаўскага раёна паведамляе, што праўленне калгаса «Чырвоны Бор» ачышчана ад кулакоў. Старшыня калгаса Краўчанка прысуджан да пазбаўлення волі на 3 гады.

ДЫСПЕТЧЭРСКУЮ СІСТЭМУ КІРАЎНІЦТВА — ПРАДПРЫЕМСТВАМ БЕЛАРУСІ

Вопыт дыспетчэрызацыі на Калужскім машына-будаўнічым заводзе

А. МАРКОЎ

Белсовет НІТО

Новыя маштабы прадпрыемстваў, новыя метады вытворчасці патрабуюць зусім іншых метадаў работы, арганізацыі працы, кіраўніцтва, планавання, уліку, адміністравання.

Метадам гібкага і аператыўнага кіраўніцтва з'яўляецца дыспетчэрызацыя. Гэта самы яркі і самы буйны на маштабах прыклад папярэдняга планавання.

АБ ЧЫМ ГАВОРЫЦЬ ВОПЫТ

КЗМ з'яўляецца піянерам дыспетчэрства на заводах. Ён увёў гэту сістэму кіраўніцтва зараз-жа пасля пастановы НКПС і ВЦСПС аб арганізацыі працы і тэхналагічнага планавання.

Схема заводакіраўніцтва пасля перабудовы прадстаўляецца ў наступным выглядзе.

Цэнтральнае месца ў новай арганізацыйнай структуры занялі аддзелы тэхналагічнага планавання, арганізацыі працы і аператыўна-вытворчы аддзел.

У арганізацыяй гэтых аддзелаў завод пачаў вызваляцца ад самакружніцтва ў тэхналагічным планаванні, бо пачалася папярэдняя глыбокая распрацоўка тэхналагічнага працэса з прыстасаваннем, інструментам, выпрацоўка тэхнічных норм.

Для аператыўнага кіраўніцтва стварэнасць на КЗМ быў арганізаваны аператыўна-вытворчы аддзел, які ўключыў у сябе тры асноўных групы:

а) планава-размеркавальную;

б) цэнтральную міжцэхавую кладовую поўфабрыкатаў і міжцэхавы транспарт;

в) агульназаводскую дыспетчэрскую групу.

Галоўная задача, якую павінна была вырашыць дыспетчэрская форма кіраўніцтва, заключалася ў тым, каб:

1. Аператыўна забяспечыць патрэбы цэхаў тэхнічнымі матэрыяльнымі ўмовамі для выканання вытворчых заданняў.

2. Арганізаваць праз цэхавых дыспетчэраў і дыспетчэрскую сувязь кантроль за выкананнем заказаў ва ўстаноўленыя па графіках тэрміны;

3. Прымаць неабходныя аператыўныя меры, забяспечваючыя нармальную работу асобных звенняў вытворчасці, ліквідаваць прарывы шляхам часовай перастаноўкі сіл на вытворчасці, аператыўна і метадычна кіраваць работай цэхавых дыспетчэраў.

Практыка дыспетчэравання падзяляецца на два этапы:

а) праддыспетчэраванне

б) паглыбленне дыспетчэравання.

Да праддыспетчэравання адносіцца:

абсталяванне прадпрыемства спецыяльнай тэлефоннай сеткаю, якая звязвае дыспетчэра з усімі неабходнымі кропкамі;

распрацоўка наглядная аператыўнага ўліку вытворчасці, які спрашчае аналітычную работу;

распрацоўка схемы дыспетчэрскай сістэмы кіраўніцтва і функцыянальнай сувязі з усімі вытворчымі ўчасткамі.

Шырокая растлумачальная кампанія сярод рабочых і ІТР.

Да паглыбленай дыспетчэрызацыі адносіцца:

Абсталяванне рабочага месца дыспетчара ўдасканаленымі сродкамі сувязі;

абсталяванне аўтаматычнымі прыборамі, злучанымі з агрэгатамі і машынамі, рэгіструючымі і сігналізуючымі прастоі варштатаў з іх прычынамі;

улік становішча і руху запасаў у кладовых і на складах праз шчоткі-аўтаматы;

аўтаматычнае кіраўніцтва сілавым абсталяваннем;

наяўнасць пазыўной і апавяшчальнай сігналізацыі.

ДЫСПЕТЧЭРСКАЯ СЛУЖБА

Дыспетчэрская служба арганізацыйна афармляецца наступным чынам.

Старшы дыспетчэр падначален непасрэдна тэхдырэктару і з'яўляецца начальнікам планава-вытворчага аддзела. Ён кіруе непасрэдна работай цэхавых дыспетчэраў і рашае пытанне аператыўнага кіраўніцтва прадпрыемствамі па выкананню плана, не ўмешваючыся ў тэхналагічны працэс.

Цэхавы дыспетчэр аператыўна падпарадкаван старшаму дыспетчэру, а адміністрацыйна—начальніку цэха.

За майстрамі і брыгадзірамі астаецца: каляндарнае размеркаванне заданняў, падрыхтоўка справаводства, тэхналагічны кантроль за якасцю работы і за станам абсталявання.

Толькі такім шляхам КЗМ пачаў перабудоўваць сваю работу.

На ўсесаюзнай галіновай нарадзе па дыспетчэрызацыі, якая адбылася ў Маскве ў сакавіку г. г., начальнік КЗМ тав. Каралефцераў у сваім выступленні адзначыў, што яны ў гэтым годзе дайшлі да самай спрошчанай структуры заводакіраўніцтва.

На такім буйным прадпрыемстве кіруюць заводам толькі начальнік і яго намеснік—тэхнічны дырэктар. Але галоўная асаблівасць заключаецца ў тым, што тэхнічнаму дырэктару падпарадкаваны толькі тры аддзелы: аддзел механізацыі завода, тэхаддзел і аддзел інструментальнай гаспадаркі. Усімі астатнімі аддзеламі і цэхамі кіруе сам начальнік завода.

АСНОВА ДЫСПЕТЧЭРЫЗАЦЫІ —ПАДРЫХТОЎКА ВЫТВОРЧАСЦІ

Калі тэхнічны дырэктар забяспечыць своечасовую і правільную падрыхтоўку чарцяжоў, інструмента, прыстасаванняў, распрацоўку тэхналагічнага працэса з улікам максімальнага і рацыянальнага выкарыстоўвання вытворчай магутнасці завода, распрацоўку тэхнічна абаснаваных норм, а таксама забяспечыць падрыхтоўку неабходнай колькасці патрэбнага інструмента і аддзел механікі (пры непасрэдным кіраўніцтве тэхдырэктара) забяспечыць планава-папераджальны і капітальны рамонт, то гэтым самым тэхнічны дырэктар забяспечыць бесперабойную і чоткую работу вытворчасці.

Тэхнічны дырэктар не можа паскардзіцца на вузкі круг сваёй работы. Наадварот, пры такой сістэме тэхдырэктар шчыльнейшым чынам звязан з цэхамі, ён ведае добра іх патрэбы, лепш чым тады, калі заўсёды сядзіць на вытворчасці. Ён мае магчымасць сачыць за работай аддзела механікі, тэхаддзела і аддзела інструментальнай гаспадаркі, даваць ім тэхнічныя ўказанні, у той-жа час не адстаючы ад навейшай тэхнічнай літаратуры.

Нельга, безумоўна, механічна падыходзіць да гэтага пытання і пераносіць гэты каштоўны вопыт КЗМ на іншыя заводы **без папярэдняй** падрыхтоўкі да гэтага, без вырашэння раду арганізацыйна-тэхнічных пытанняў.

Ідучы па шляху далейшай рэарганізацыі, на КЗМ скарацілі планава-вытворчыя аддзелы і стварылі планавы аддзел. Для таго, каб можна было сачыць за ходам выканання заданняў штодзённа, вытворчасць кожнай машыны ў серыйным парадку разбіта на зусім скончаныя вытворчыя вузлы. Гэта дасць магчымасць заўсёды ўстанавіць дакладна процант выканання плана, сачыць за камплектнасцю.

На ўсесаюзных галіновых нарадах былі падведзены вынікі ўкаранення дыспетчэрызацыі ў прамысловасць. Дыспетчэрства ахапіла не толькі машынабудаўніцтва. Маецца ўжо багаты вопыт дыспетчэрызацыі электрапрамысловасці, воднага транспарта, МТС, лёгкай прамысловасці і рада іншых галін.

„КЗМ" НЕ АДЗІН

За вельмі кароткі перыяд перададзеныя прадпрыемствы—падшыпнікавы завод, завод ім. Авіяхіма, № 39, Ленінградская тэкстыльная фабрыка «Рабочий» і рад іншых—асвоілі новую тэхніку арганізацыі кіраўніцтва прадпрыемствам і з'яўляюцца зараз перадавымі прадпрыемствамі з дыспетчэрскай сістэмай кіраўніцтва, перагрымгшыя на сваім шляху цяжкасці механізацыі.

На заводзе шарыкападшыпнікаў а лапамі цэнтральнай лабараторыі прамысловага дыспетчэравання створаны новы дыспетчэрскі культ, які цяпер дае ўсім патрабаванням дыспетчэрызацыі. Вельмі добра абсталявана светавая сігналізацыя ад рабочага месца і да рабочага месца. Устаноўлены аўтаматычныя вучотчыкі работы барабанаў.

Да сакавіка г. г. прамысловая дыспетчэрызацыя праводзілася як эксперымент і з'яўлялася толькі праблемай. Дыспетчэрская асніжэнне праводзілася вышукальным, часам саматужным шляхам.

Загад па Наркамцяжпраму СССР ад 22 сакавіка палажыў канец саматужніцтву, і дыспетчэрызацыя пераведзена на дзяржаўныя рэйкі. Вылучана 56 буйнейшых прадпрыемстваў пяжкай прамысловасці для абавязковага пераводу ў гэтым годзе на дыспетчэрызацыю.

Па лініі НКЛП СССР вылучана толькі 20 самых буйнейшых прадпрыемстваў, падлягаючых пераводу на дыспетчэрызацыю ў бягучым годзе.

Вылучэнне абмежаванай колькасці прадпрыемстваў тлумачыцца тым, што ў гэтым годзе прамысловасць не зможа задаволіць усёй патрэбнасці ў дыспетчэрскай апаратуры. Але гэта ніколькі не выключае падрыхтоўчую работу на дыспетчэрызацыі—падрыхтоўку арганізацыйных мер на прадпрыемствах.

ЗА ДЫСПЕТЧЭРЫЗАЦЫЮ БУЙНЕЙШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БЕЛАРУСІ

Не гледзячы на тое, што піяданае прадпрыемства Беларусі не ўключана на лініі сувязных наркаматаў для пераводу на дыспетчэрскую сістэму кіраўніцтва неўключэнне тлумачыцца тым, што ў Беларусі гэтым пытаннем гаспадарнікі да гэтага часу не займаліся і не цікавіліся. Пацвярджэнне гэтага можа служыць тое, што на ўсесаюзных галіновых нарадах па дыспетчэрызацыі з Беларусі быў толькі адзін прадстаўнік ад Белсовета НІТО у бягучым годзе на нарадзе па пытанню дыспетчэрызацыі наркомам лёгкай прамысловасці БССР т. Балцінным 26 чэрвеня вылучаны два прадпрыемствы—віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ», якія павінны прыступіць да распрацоўкі дыспетчэрскай сістэмы кіраўніцтва для сваіх прадпрыемстваў.

Акрамя гэтага па ініцыятыве Белсовета НІТО пераведзіцца на дыспетчэрскую сістэму кіраўніцтва Добрушская папяровая фабрыка «Герой труда», якая патрабуе карэннай арганізацыйна-тэхнічнай перабудовы кіраўніцтва фабрыкай. Для гэтай фабрыкі ўжо выпрацаван праект схемы дыспетчэрызацыі.

Для стварэння ў Беларусі трох вопытна-паказальных прадпрыемстваў з новай тэхнікай арганізацыі кіраўніцтва патрабуецца вельмі сур'ёзны падыход у гэтай справе, бо немагчыма і шкодна механічна пераносіць сістэму дыспетчэрызацыі буйнейшых прадпрыемстваў на больш дробныя.

У заключэнне неабходна адзначыць, што дыспетчэраванне ёсць аператыўнае кіраўніцтва вытворчасці на аснове каляндарнага планаграфіка, з безупынным ажыццяўленнем кантролю за выкананнем заданняў і з учотам усіх фактараў, суправаджаючых і характарызуючых вытворчы працэс.

С. КАЗНАЧЭЕЎ.

За рубяжом

ПАМЁР ГІНДЭНБУРГІ

БЕРЛІН, 2 жніўня (БЕЛТА). Прэзідэнт германскай рэспублікі Гіндэнбург скончыўся сёння ў 11 гадзін раніцы ў сваім маёнтку ў Нейдэку.

***

Паўль фон-Бенекендорф Гіндэнбург нарадзіўся ў 1847 годзе ў Познані, у афіцэрскай сям'і. Скончыўшы кадэцкі корпус, уступіў лейтэнантам у армію. Удзельнічаў у ваенным паходзе супроць Аўстрыі ў 1866 годзе і ў франка-прускай вайне ў 1870-71 гг. У 1900 годзе быў назначан генерал-лейтэнантам і камандзірам дывізіі, а ў 1903 годзе камандзірам армейскага корпуса. У 1911 годзе Гіндэнбург пашоў у адстаўку.

У пачатку сусветнай вайны, пасля раду паражэнняў германскай арміі ва ўсходняй Прусіі, Вільгельм II назначыў Гіндэнбурга камандуючым арміяй, якая дзейнічала на рускім фронце. Гіндэнбург стварыў сабе шырокую вядомасць, як ваенны начальнік, разгромам царскай арміі ў Тэненбергу і ў Мазурах, калі былі разбіты дзве рускія арміі—Самсонава і Рэненкампфа. У 1916 годзе Гіндэнбург быў назначан галоўнакамандуючым германскай арміяй.

Перамогі Гіндэнбурга стварылі яму гучную славу лепшага германскага палкаводца ў час імперыялістычнай вайны. Ён стаў кумірам германскай буржуазіі. Пасля падзення манархіі і бегства Вільгельма Гіндэнбург захаваў кіраўніцтва арміяй да 1919 года. Калі ўспыхнула рэвалюцыя, Гіндэнбург прадставіў сябе ў распараджэнне ўрада Эберта і кіраваў адступленнем германскай арміі і яе дэмабілізацыяй.

У чэрвені 1919 года Гіндэнбург пайшоў у адстаўку і да 1925 года жыў у Гановеры.

Пасля смерці першага прэзідэнта германскай рэспублікі Эберта правыя партыі высунулі Гіндэнбурга кандыдатам на пост прэзідэнта. Большасцю галасоў Гіндэнбург быў выбран. У той час яму было 78 год.

Гіндэнбург абараняў матэрыяльныя інтарэсы Гогенцолернаў і з'яўляўся ганаровым старшынёй баявой арганізацыі, створанай для аднаўлення манархіі — «Стапёвы шлём».

У 1932 годзе, калі германскія нацыянал-сацыялісты высунулі кандыдатам у прэзідэнты рэспублікі Гітлера, сацыял-дэмакраты, партыя цэнтра і дэмакраты аб'явілі сваім кандыдатам Гіндэнбурга, разглядаючы яго як «меншае зло». Гіндэнбург быў у другі раз выбран прэзідэнтам. Пры гітлераўскім рэжыме вакол Гіндэнбурга аб'ядналіся кансерватыўныя буржуазныя і аграрныя колы, а таксама рэйхсвер на чале з фон-Папенам, Блюмбергом і інш.

Увасабляючы традыцыі кайзераўскай Германіі і карыстаючыся вялікім аўтарытэтам, Гіндэнбург неаднаразова згладжваў супярэчнасці, якія ўсё ўзмацняліся паміж асобнымі групамі кіруючага лагера.

ПОСТ ПРЭЗІДЭНТА АБ'ЯДНАЕЦЦА З ПАСТОМ РЭЙХСКАНЦЛЕРА

ГІТЛЕР—ГЛАВА ДЗЯРЖАВЫ

БЕРЛІН, 2 жніўня (БЕЛТА). Яшчэ ўночы адбылося тэрміновае пасяджэнне германскага габінета, на якім быў прынят новы закон аб «главе дзяржавы». Зараз гэты закон апублікован за подпісам Гітлера і ўсіх міністраў.

Закон гаворыць:

«1) Пост прэзідэнта аб'яднаецца з пастом рэйхсканцлера. З прычыны гэтага функцыі прэзідэнта пераходзяць да правадыра і рэйхсканцлера Адольфа Гітлера. Ён назначае свайго намесніка.

2) Гэты закон уступае ў сілу з моманту скончэння германскага прэзідэнта Гіндэнбурга».

САЛДАТЫ РЭЙХСВЕРА ПРЫВОДЗЯЦЦА ДА ПРЫСЯГІ ГІТЛЕРУ

БЕРЛІН, 2 жніўня (БЕЛТА). Германскі ваенны міністр Бломберг на аснове закона аб главе дзяржавы прадпісаў неадкладна прывесці да прысягі Гітлеру салдат рэйхсвера.

ГОЛАД У КІТАІ

ШАНХАЙ, 31 ліпеня. (БЕЛТА). Рысавыя пасевы ва многіх раёнах Усходняга Кітая гінуць ад засухі і ад паводкі. У 40 акругах правінцыі **Цзянсу** загінулі ад засухі пасевы звыш 20 млн. му (адзін му—каля адной шаснаццатай га). У 69 акругах правінцыі **Чжэцзян** загінулі пасевы на 18 млн. му.

44 паветы ў правінцыі **Хунань** пад пагрозай голаду, тысячы сялян бягуць у гарадскія цэнтры.

Газеты прадказваюць магчымасць масавага голаду. Цэны на рыс у Шанхаі падняліся ўдвая. **У НЕКАТОРЫХ РАЁНАХ ПАЧАЛІСЯ СЯЛЯНСКІЯ ХВАЛЯВАННІ.**

АНТЫВАЕННЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ І МІТЫНГІ

СТАКГОЛЬМ. 2 жніўня (БЕЛТА). Учора адбылося 5 рабочых сходаў і вулічныя дэманстрацыі супроць вайны і фашызма. На цэнтральным мітынгу, скліканым компартыяй з удзелам 10 тыс. рабочых, прынята рэзалюцыя, заклікаючая да жалезнага адзінага пролетарскага фронта ў антываеннай і антыфашысцкай барацьбе і ў абарону СССР. **Рэзалюцыя патрабуе неадкладнага вызвалення Тэльмана і іншых змагароў супроць фашызма.**

У іншых гарадах Швецыі таксама адбыліся масавыя мітынгі і дэманстрацыі.

Паводле паведамлення з Капенгагена, на цэнтральным антываенным мітынгу, скліканым компартыяй, прысутнічала 15 тыс. рабочых.

УПАДАК ЭКСПАРТА Ў ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 31 ліпеня (БЕЛТА). Гэтымі днямі ў вядомым цэнтры германскай металургіі Залінгене адбылася канферэнцыя прадпрыемцаў і прадстаўнікоў аб'яднанняў, працуючых на экспарт. Выступленні буйных прамыслоўцаў і экспарцёраў былі надзвычай хмурнымі. Прадпрыемцы патрабавалі такіх мер, якія маглі-б забяспечыць канкурэнтаздольнасць Германіі на заграничным рынку.

Германскі экспарт упаў у першым квартале 1934 года на 8 проц., у той час як сусветны гандаль толькі на 2 проц.

Кіраўнік Рэйнска-Вестфальскага саюза экспарцёраў і аптавікоў Брунзберг указаў, што калі германскі знешні гандаль «нават нязначна спадзе», гэта будзе мець цяжкія вынікі.

ПРЫЕЗД ЛІТОЎСКАГА МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ У МАСКВУ

МАСКВА, 1 ЖНІЎНЯ. (БелТА). 1-га жніўня ў Маскву прыбыў міністр замежных спраў Літоўскай рэспублікі г. Лазарайціс з жонкай.

Разам з міністрам у Маскву прыехалі літоўскі пасланнік у СССР г. Балтрушайціс, кансультант міністэрства замежных спраў г. Петкевічыус і рэферэнт міністэрства замежных спраў г. КАТКЕВІЧЫУС.

ПРЫЁМ У ТАВ. М. М. ЛІТВІНАВА

Народны камісар па замежных справах тав. М. М. Літвінаў даў ў гонар міністра замежных спраў Літоўскай рэспублікі г-на Лазарайціса абед. На абедзе прысутнічалі літоўскі пасланнік г-н Балтрушайціс, члены ўрада, намеснікі народнага камісара па замежных справах, адказныя работнікі НКЗС і паўпрэд СССР у Літве тав. Карскі.

Тав. Літвінаў і г-н Лазарайціс абмяняліся наступнымі прамовамі.

ПРАМОВА ТАВ. М. М. ЛІТВІНАВА

Гаспадзін міністр, гаспадзін пасланнік, гаспада,

са шчырай прыемнасцю я вітаю вас, гаспадзін міністр, ад імя Саюзнага ўрада і ад свайго ўласнага ў сталіцы Совецкага Саюза

Саюз Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік з Літоўскай рэспублікай звязваюць ужо 14 год узы бесперапыннай дружбы, якая развілася на непахіснай аснове мірнага дагавору 1920 года. Гэта дружба жывілася, між іншым, агульнай абодвым дзяржавам адданасцю да ідэі міру.

З вялікім задаваленнем я магу падкрэсліць, што мірная ініцыятыва Совецкага ўрада нямленна сустракала поўнае разуменне і спачувальныя адносіны з боку ўрада Літоўскай рэспублікі. Сведкай гэтаму з'яўляецца падпісанне ў 1926 годзе Літвой, адным з першых нашых суседзяў, пакта аб ненападзе, прадоўжанага спачатку ў 1931 годзе, на год, а затым у гэтым годзе яшчэ на 10 год, і ўдзел Літоўскай рэспублікі ва ўсіх астатніх пагадненнях, прапанаваных Совецкім Саюзам яго суседзям у ажыццяўленне яго мірнай палітыкі.

Я асабліва рад адзначыць, што і апошнія крокі Совецкага урада ва ўказаным напрамку неадкладна сустракалі ў Літве разуменне і адабрэнне, і я дазволю сабе выказаць упэўненасць у тым, што і ў далейшым будзе прадаўжацца гэта благатворнае супрацоўніцтва абодвух краін на карысць міру.

Народы Совецкага Саюза, верныя агалошанаму Окцябрскай рэвалюцыяй і паслядоўна праваздзімаму совецкім урадам прынцыпу самавызначэння народаў, з нязменнай сімпатыяй сочаць за ўмацаваннем незалежнасці Літоўскай дзяржавы і развіццём яе нацыянальнага будаўніцтва. Разам з тым яны ўсведамляюць вялікае значэнне для міру на Ўсходзе Еўропы, мірнага і справядлівага вырашэння непасрэдна датычных Літвы міжнародных спрэчных пытанняў.

На аснове прыязных палітычных адносін паміж нашымі краінамі паспяхова развіваліся і эканамічныя адносіны і мацнелі культурныя сувязі, прагрэсавала ўзаемнае азнаямленне друг з другам народаў нашых краін.

Гаспадзін міністр, дазвольце мне ў заключэнне выказаць упэўненасць у тым, што ўстанаўленне асабістага кантакта з вамі ў якасці кіраўніка знешняй палітыкі Літоўскай рэспублікі, і абмен думкамі з вамі па ўсіх актуальных пытаннях, якія цікавяць нашы краіны, яшчэ больш умацуе дружбу паміж нашымі дзяржавамі і тое ўзаемнае давер'е, якім заўсёды адзначаліся іх узаемаадносіны.

Я падымаю бакал за далейшае развіццё прыязных узаемаадносін паміж СССР і Літоўскай рэспублікай, за росквіт Літоўскай дзяржавы, за здароўе прэзідэнта Літвы і нашых дарагіх гасцей, гаспадзіна міністра Лазарайціса і яго жонкі.

ПРАМОВА г. ЛАЗАРАЙЦІСА

Гаспадзін народны камісар, гаспада,

я лічу сваім прыемным доўгам выказаць вам і саюзнаму ўраду шчырую падзяку за любезныя прывітанні. Я карыстаюся гэтым выпадкам, каб паўторна падзякаваць вас за любезнае запрашэнне прыбыць у сталіцу Совецкага Саюза, якое дае мне магчымасць пазнаёміцца з вамі, гаспадзін народны камісар, выдатным кіраўніком знешняй палітыкі Совецкага Саюза, з якім Літву звязваюць узы 14-годняй бесперапыннай дружбы.

Пачатак гэтай шматгадовай, ужо традыцыйнай для нашых адносін, дружбы, якая выцякае з агульнага нашым дзяржавам імкнення да ўмацавання міру, пакладзен мірным дагаворам, які літоўская дзяржава, аднаўленая вольнай і незалежнай воляй літоўскага народу, заключыла з Саюзам Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік 12 ліпеня 1920 года. Гэты дагавор, аснованы на прызнанні Літвы ў яе нацыянальных граніцах, пастаянна застаецца непарушнай асновай нашых прыязных адносін. Такі характар гэтых адносін адлюстроўваецца і ў юрыдычных актах 1926 года, якія ў гэтым годзе былі прадоўжаны да канца 1945 года.

Літва, перанесшая на сабе цяжары вайны, і да гэтага часу адчуваючая яе наследствы, лічыць, што захаванне міру з'яўляецца неабходнай мэтай міжнародных намаганняў. Таму мірная ініцыятыва совецкага ўрада заўсёды сустракала поўнае разуменне і спачувальныя адносіны з боку літоўскага ўрада. Вы заўсім справядліва выразілі ўпэўненасць ў тым, што благатворнае супрацоўніцтва абодвух дзяржаў у мэтах умацавання міру будзе прадаўжацца. Гэта і ёсць яшчэ адна рэальная аснова для шчырай дружбы і добрасуседскіх адносін паміж Літвой і Совецкім Саюзам.

Намаганні совецкага ўрада ўмацаваць мір і безапаснасць з шчырай сімпатыяй вітаюцца літоўскім урадам.

Я асабліва рад чуць вашу заяву аб тым, што народы Совецкага Саюза сазнаюць усю важнасць мірнага і справядлівага вырашэння непасрэдна датычных Літвы міжнародных спрэчак для міру на Ўсходзе Еўропы.

Я спяшу запэўніць вас, што літоўскі народ з такой-жа сімпатыяй адносіцца да поспехаў народаў Совецкага Саюза на шляхах матэрыяльнага і культурнага прагрэса.

Я асабліва рад канстатаваць, што нашы прыязныя палітычныя адносіны нязменна развіваюцца, садзейнічаючы пашырэнню эканамічных адносін і забеспячэнню ўзаемнага азнаямлення нашых народаў, а таксама і ўмацаванню культурных сувязей.

Я лічу адной з важнейшых маіх задач далейшае развіццё нашых прыязных адносін і ўмацаванне ўжо здаўна існуючага ў нашых узаемаадносінах давер'я. Я дазволю сабе выразіць упэўненасць, што асабістая сустрэча з вамі, гаспадзін народны камісар, будзе садзейнічаць ажыццяўленню гэтай маёй задачы.

Я падымаю бакал за далейшае развіццё прыязных узаемаадносін паміж Саюзам Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Літоўскай рэспублікай, за росквіт совецкай дзяржавы і яе народаў, за здароўе старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза Совецкіх Сацыялістычных рэспублік, за ваша здароўе, гаспадзін народны камісар, і здароўе вашай жонкі.

***

Затым адбыўся прыём, на якім прысутнічалі члены ўрада, дыпламатычны корпус і адказныя работнікі НКЗС.

СОВЕЦКАЯ ЭСКАДРЫЛЬЯ, ВЯРНУЛАСЯ Ў МАСКВУ

МАСКВА, 1 жніўня. (БЕЛТА). 1-га жніўня ўвечары эскадрылья совецкай ваеннай авіяцыі, вылятаўшая з візітам у Польшчу, вярнулася ў Маскву.

Зрабіўшы круг над аэрадромам, цяжкія самалёты плаўна спусціліся на зямлю і праз некалькі мінут, падрулёўшы да сустракаючых, выстраіліся ў адну лінію. Дэлегацыя была сустрэнута начальнікам ваенна-паветраных сіл РСЧА тав. **Алксніс**ам, прадстаўнікамі грамадзянскага паветранага флота, прадстаўнікамі польскага пасольства, народнага камісарыята замежных спраў і прадстаўнікамі друку.

Узначальваўшы дэлегацыю намеснік начальніка штаба РСЧА тав. **Межзнінаў** выказаў экіпажу падзяку за добра праведзены пералёт.

Совецкія самалёты ляцяць на сваім бензіне, які яны забралі з сабой пры вылеце з Масквы і таму ў Варшаве бензінам не папаўняліся.

ЛЕПШЫЯ БРЫГАДЗІРЫ ТРАКТАРНЫХ ПАЛЯВОДЧЫХ БРЫГАД ПРЭМІРАВАНЫ

МАСКВА, 1 жніўня. (БЕЛТА). Наркамзем СССР падвёў вынікі ўсесаюзнага спаборніцтва брыгадзіраў трактарных і паляводчых брыгад на веснавой сяўбе, пачатага па выкліку калгасных брыгадзіраў Міласць-Куракінскай МТС (Азова-Чорнаморскі край). Прэміравана 227 калгасных і 26 трактарных брыгадзіраў.

Прэміі—веласіпеды, пуцёўкі ў дамы адпачынку, патэфоны, гадзіннікі, радыёапараты. Дырэктарам МТС і начальнікам палітаддзелаў прапанавана шырока папулярызаваць вопыт прэміраваных брыгадзіраў і на аснове далейшага разгортвання спаборніцтва забяспечыць правядзенне ўборкі ўраджаю ў максімальна сціслыя тэрміны і без страт.

УРАЧЫСТАЯ ПЕРАДАЧА САМАЛЁТА „ПІОНЕР БЕЛАРУСІ" АЭРАКЛУБУ ІМЯ МОЛАКАВА

31 ліпеня на Менскім гарнізонным стрэльбішчы працягваліся стралковыя спаборніцтвы юных стралкоў. Першае месца ў камандных спаборніцтвах заняла Орша. У індывідуальных спаборніцтвах далі найлепшыя паказальнікі таксама піонеры Аршаншчыны: **БУГАЁЎ** і **ГАТОЎКІН.** Яны з'яўляюцца кандыдатамі на ўсесаюзныя дзіцячыя стралковыя спаборніцтвы.

Вечарам 31 ліпеня на аэрадроме адбылася ўрачыстая перадача Менскаму аэраклубу імя Молакава самалёта «Піонер Беларусі», пабудаванага на сродкі піонераў і школьнікаў БССР.

Першымі пасажырамі на самалёце былі лепшы стралок Оршы **Бугаёў**, лепшы авіямадэлісты **Міхеліс** (Магілеў) і **Драздоў** (Заходняя вобласць). Пасля ўрачыстай перадачы самалёта быў паказан вышэйшы пілатаж і палёты на планерах.

БЕЛТА.

АБ ПАРАДКУ ВЫЛІЧЭННЯ ЎРАДЖАЙНАСЦІ ДЛЯ АДНЯСЕННЯ КАЛГАСАЎ ДА ТОЙ ЦІ ІНШАЙ ГРУПЫ ПА ЎРАДЖАЙНАСЦІ

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Растлумачыць, што ў адпаведнасці з прыкладным дагаворам машынатрактарнай станцыі з калгасам, зацверджаным СНК СССР 17 лютага 1934 года (з. з. СССР 1934 года № 11, стр. 68) і дапаўняючай гэты дагавор пастановай СНК Саюза ССР ад 1-га ліпеня 1934 г. (з. з. Саюза ССР 1934 г. № 35, стр. 277) вылічэнне ўраджайнасці для аднясення калгасаў да той ці іншай групы робіцца з уключэннем ураджайнасці крупяных хлябоў (у тым ліку проса) і бабовых, а на Украіне, у Крыму, у Азова-Чорнаморскім і Паўночна-Каўказскіх краях (акрамя Кабардына-Балкарскай вобласці) і ў Закаўказзі—з уключэннем таксама ўраджайнасці кукурузы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Кіраўнік справамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР **І. МІРОШНІКАЎ.**

Масква, Крэмль, 1 жніўня 1934 г.

ДЭЛЕГАЦЫЯ ЮНЫХ УДАРНІКАЎ АБАРОНЫ Ў тав. ГАЛАДЗЕДА

2 жніўня дэлегацыя юных ударнікаў абароны ў ліку 70 чалавек наведала старшыню СНК БССР тав. **ГАЛАДЗЕДА.** На прыёме прысутнічалі т.т. **Галадзед, Саак'ян, Галендо, Стукалаў** і іншыя.

— Хто з вас лепш страляе?—пытае тав. **Галадзед.**

Піонер **Бугаёў** расказвае, як ён заняў першае месца на стралковых спаборніцтвах злёта юных ударнікаў абароны, выбіўшы па ўсіх практыкаваннях 69 ачкоў з 78 магчымых.

Тав. **Галадзед** асабліва цікавіўся канструкцыяй педальных машын, прадстаўленых на злёце. Піонер **Сафонаў** (Лісіповічы) расказаў, як ён сканструяваў свой педальны аўтамабіль. На спаборніцтве педальных аўтамабіляў ён прайшоў за 1 мінуту 37 секунд дыстанцыю ў 250 метраў і заняў першынство. Авіямадэліст **Гусін** (Магілеў) падрабязна азнаёміў з тым, як ён пабудаваў свой планер.

Самая маладзейшая ўдарніца абароны **Ніна Загрыва** (Копыль) расказала, як яна заваявала першынства ў спаборніцтвах па СПА, надзеўшы супрацьгаз за 2,5 секунды, замест 5 секунд па норме.

— Я абрала спецыяльнасць **санітаркі**,—кажа піонерка—лепшая санітарка **Маркевіч Валя** (Слуцак), бо мне вельмі падабаецца гэта работа і я абавязкова буду ўрачом.

Вельмі доўга гутарыў тав. **Галадзед** з радыстам **Гайдуковым** (Гомель). Тут-жа т. Галадзед растлумачыў розніцу паміж кароткімі і доўгімі хвалямі.

Таксама вельмі цікавіўся тав. Галадзед, як разгортваецца музычная справа сярод удзельнікаў злёта юных ударнікаў абароны, указаўшы на неабходнасць аддаць гэтаму віду мастацтва больш увагі.

Па просьбе піонераў тав. **Галадзед** падрабязна расказаў свой жыццёвы шлях.

Ніна Загрыва ад імя ўдзельнікаў злёта дзякавала тав. Галадзеду за гарачы прыём і запэўніла, што раз'ехаўшыся па раёнах, піонеры яшчэ з большай энергіяй будуць вывучаць ваенную тэхніку, змагацца за ўмацаванне абароназдольнасці краіны. Пад громкія апладысменты і крыкі «ура» яна завязвае тав. Галадзеду чырвоны гальштук і кажа, што тав. Галадзед абіраецца ганаровым піонерам—дэлегатам злёта.

(БелТА).

Усебеларускія шахматна-шашачныя спаборніцтвы імя газеты „Звязда"

1-га жніўня ў Доме партакыва пачаліся ўсебеларускія шахматна-шашачныя спаборніцтвы.

Разыграны ўжо два туры, і пераможцы высвятляюцца па шахматах. **1-я група: Верасаў** (Менск) выйграў у Эйдэльмана (Гомель) і ў адкладзенай партыі з **Грыгор'евым** (Гомель) мае перавагу. **Кацнельсон** (Бабруйск) выграў у **Дубравенскага** (Магілеў). **2-я група:** без пройгрышаў **Касперскі А.** (Менск) і **Шапаеў** (Полацк). **3-я група:** малады аршанскі ігрок **Парэцкі** добрай ігрой дабіўся ініцыятыўнай ігры супроць вядомага іграка **Сташэўскага** (Магілеў). Партыя адкладзена ў роўным становішчы. У другім туры **Парэцкі** выйграў у **Чарнеўскага** (Барысаў). **4-я група: Давыдаў** (Клімавічы) і **Маневіч** (Гомель) сваёй партыі не закончылі. На першым месцы **Гаві** (Менск). **5-я група:** майстар **Сліч** выйграў у **Ю. Майзеля** (Менск), а ў другім туры не закончыў партыі з маладым менскім іграком **Зісманам В.**, у якога многа шансаў на нічыю. Без пройгрышаў **Іваноў** (Бабруйск). **6-я група:** на першым месцы **Камянецкі** (Менск), які выйграў у **Дубінскага** (Мозыр) і **Клюева** (Магілеў), далей **Жудро** (Віцебск) і **Шраговіч** (Гомель). **7-я група:** барацьба паміж **Насцюшонкам** і **Жытневічам** (Менск) і **Ратнікавым** (Орша).

Жаночы шахматны турнір. Выйгралі: **Гарб** (Віцебск) у **Ільіной** (Гомель) і **Каган** (Бабруйск) у **Брыт** (Віцебск). Не закончылі партыі **Нікалаенкава** (Менск) з **Інтарэсавай** (Магілеў).

Жаночы шашачны турнір. Выйгралі **Белкіна** (Менск) у **Бас[illegible]** (Бабруйск) і **Зісерман** (Віцебск) у **Кроль** (Магілеў).

Шашачны турнір-чэмпіянат. Першая група: майстар **Гардон** выйграў у **Ледэра** і **Ракітніцкага** (Менск). **Ходыраў** (Віцебск) — у нічыю з **Школьнікам** (Горкі) і **Ракітніцкім** (Менск). **Красніцкі** (Магілеў) выйграў у **Гарадзецкага М.** (Бабруйск). **Другая група: Берлінкоў** (Менск) выйграў у **Сіманава** (Гомель) і **Касперскага В.** (Менск), **Пеўзнер** (Гомель) выйграў у **Эзрохіна** (Орша). **3-я група:** на першым месцы **Гардзевіч** (Менск), які выйграў у **Кагана** (Віцебск) і **Цыпкіна** (Бабруйск), таксама без пройгрышаў **Ліхадзіеўскі** (Менск) і **Розенблюм** (Орша). **4-я група:** на першым месцы **Берман** (Менск), які выйграў у **Крапуновіча** (Віцебск) і **Маслянскага** (Менск). Добра іграе школьнік **Гарадзецкі Б.** (Бабруйск), які выйграў у **Маслянскага** (Менск) і арабіў партыю ў нічыю з **Багамольнікавым** (Менск).

Ігра адбываецца ў Доме партакыва з 11 да 3-х гадзін дня і з 6-ці да 9 гадзін вечара.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма ГК КП(б)Б даводзіць да ведама сакратароў парткомаў, і дырэктароў прадпрыемстваў, што наступныя заняткі адбудуцца 5 жніўня ў Доме партактыва. Сакратары парткомаў займаюцца з 10 раніцы да 2 дня, а дырэктары з 7 да 10 гадзін вечара.

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма ГК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

ПАМЯШКАННЕ БЕЛДЗЯРЖТЭАТРА | БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
4 жніўня
КНЯЗЬ ІГАР
опера ў 4-х дзеях муз. БАРАДЗІНА
Пастаноўка галоўнага рэжысёра Чарняўскага Б. А.
Мастацкі кіраўнік засл. арт. рэсп. Гітгарц І. А.
Пачатак у 8 гадз. 30 мін. веч.
Білеты ў касе тэатра з 12-2 і з 5-8 г. 30 м. веч. і ў раб. касе с 12-2 і з 4-6 г. веч.

МЕНСКІ АЎТАДАРОЖНЫ ТЭХНІКУМ
Галоўдартранса БССР аб'яўляе
АСЕННІ НАБОР
на першы курс дарожна-будаўнічай спецыяльнасці на беларускае і яўрэйскае аддзяленні.
Усе паступаючыя трымаюць іспыты за курс непоўнай сярэдняй школы па грамадазнаўству, матэматыцы, фізіцы, хіміі і беларускай мове. Узрост паступаючых—ад 16 да 30 год. Прыём заяў да 15 жніўня. Студэнты забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагародніх—і інтэрнатам. Пры тэхнікуме ёсць сталоўка.
Да заявы прыкласці завераную анкету, даведку аб соцпаходжанні і соцстано вішчы паступаючага і яго бацькоў; для калгаснікаў—даведку аб часе ўступлення ў калгас, а для ваеннаабавязаных—ваенны білет за 1933 г.; даведку аб узросце, асвеце, здароўі, 2 заверэныя фотакарткі і марак на 40 кап.
Тэхнікум дае годнасць тэхніка па пабудове і эксплуатацыі аўтагужавых дарог. Тэрмін навучання—3 з пал. гады. Пры паступленні перавага рабочым аўтадарожнага транспарта і іх дзецям. Аб тэрміне іспытаў будзе паведамлена кожнаму дадаткова. Пачатак заняткаў з 1 верасня.
Дакументы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Студэнцкі зав. д. 3, аўтадарожнаму тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Гуляны кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" | Гуляны фільм ЧЭЛЮСКІН (Герой Арктыкі)
Кіно „Інтэрнацыянал" | Усходні фільм ІСМЕТ
КІНО „СПАРТАК" | Выдатны мастацкі фільм „ОТЕЦ СЕРГИЙ" драма ў 7 частках.

Барысаўская школа Леспрамгасуча „ЛПВ" трэста „ЛЕСБЕЛ"
абвяшчае асенні набор
у колькасці 180 чал. па наступных спецыяльнасцях:
1. Кваліфікаваных рабочых па валцы, раскрыжоўцы і разделы леса—90 чал.
2. Кваліфікаваных рабочых па малярству і плытавому лесасплаву—60 чал.
3. Кваліфікаваных рабочых па первічнай механічнай перапрацоўцы драўніны—30 чал.
Тэрмін навучання 6 месяцаў (два месяцы тэорыі, 4 месяцы вытворчай практыкі).
Усе прынятыя забяспечваюцца: інтэрнатам, сталоўкай, забеспячэнне па 1 спісу 1 катэгорыі і стыпендыяй у залежнасці ад паспяховасці ад 40 да 50 руб. у месяц. Акрамя стыпендыі ў часе вытворчай практыкі вучні дадаткова атрымліваюць зарплату за выконаную работу.
Па скончэнні школы накіроўваюцца на сталую працу ў леспрамгасы і сплаўканторы ў якасці кваліфікаваных рабочых.
Узрост паступаючых ад 17 да 23 год з адукацыяй 5-6-7 груп сямігодкі.
Да заявы неабходна далучыць наступныя дакументы: даведку аб соцстановішчы, аб праве голасу, аб адукацыі, метрыку, аб стане здароўя, заведчаную анкету і накі равань па адрасу: г. Барысаў, Андрэеўская № 22, Лесашколе.
Прыём заяў да 25 верасня. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка г.г.
Дырэктар лесашколы М. ГУРЧАН.

ДЗЯРЖЦЫРК | 3, 4, 5, 6 і 7 жніўня
АПОШНІЯ ГАСТРОЛІ ПЕРШАГА ЦЫКЛА.
Новыя гастролі ПРАЎДЗІНАЙ І ВОЛЬНАГА, РОЗАНО, МІКЛАЎ і яшчэ 10 нумароў.
6 і 12 жніўня ў 2 гадз. дня РАНІШНІКІ па зніжаных цэнах.

МАРЫНА-ГОРСКІ
садова-гародны тэхнікум
аб'яўляе ПРЫЁМ
студэнтаў на першы курс наступных аддзяленняў:
1. Тэхналогіі с.-г. прадукту — рыхтуе малодшых інжынераў тэхнікаў працоўных заводаў сістэмы Наркамснаба.
2. Пладова-ягаднае—рыхтуе малодшых агрономаў-саводаў-ягаднікаў. На гэтым аддзяленні адкрываецца секцыя пчалярства.
3. Гародніе—рыхтуе малодшых агрономаў гародніноваў.
Пладова-ягаднае і гародніе аддзяленне рыхтуюць спецыялістаў у сістэму НКЗ для працы ў прыгарадных раёнах і МТС і буйных гаспадарках садоўніцтва і гародніцтва.
Прымаюцца асобы з адукацыяй ва сямігодку. Заявы прымаюцца па 20 жніўня. Іспыты з 20 па 1 верасня. Пачатак заняткаў з 1 верасня.
Да заявы неабходна прыкласці засведчаную анкету, аб адукацыі, аб соцстановішчы і паходжанні, аб узросце, аб адносінах да вайсковай павіннасці і аб стане здароўя. Стыпендыя па паспяховасці ад 25 да 75 р. Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Ёсць свая сталоўка. Тэхнікум знаходзіцца пры ст. Пухавічы, з гор. Менскам зносны прыгарадны поездам.
Адрас: п-а Марына-Горка, Пухавіцкага раёна, с.-г. тэхнікум.
Дырэкцыя.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТ"
аб'яўляе набор курсантаў
на 6-месячныя КУРСЫ
па падрыхтоўцы БУХГАЛТАРОЎ для МТС і саўгасаў із-хмесячныя —інструктароў калгаснага ўчота для МТС і райза.
Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй; бухгалтары—ад 100 да 150 р., інструктары—ад 75 да 125 р. у месяц у залежнасці ад паспяховасці. Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца, а замест гэтага кожнаму выплачваецца кватэрных па 25 р. у месяц. Курсанты прымаюцца на сталоўкі.
На курсы прымаюцца асобы ніжэй нашых стажрахункоўцаў працы не менш 2-х год і адукацыю не ніжэй сямігодкі. Пераважна курсы будуць камплектавацца рахункоўнымі работнікамі МТС і саўгасаў і па скончэнні курсаў курсанты будуць накіраваны па месцу іх ранейшай работы.
Да заяў трэба далучыць наступныя дакументы: аб адукацыі, прадоўным стажы, выдаленні ад працы, або камандыроўку, аб соцпаходжанні, узросце.
Подача заяў да 13 жніўня. Аб залічэнні і пачатку заняткаў будзе паведамлена на пошце. Для адказу патрэбна прыкласці марак на 40 кап.
Заявы з дакументамі накіроўваць па адрасу: г. Менск, Міхайлаўская 1-4 Нав. К-ту „Союзоргучет". Канцылярыя курсаў адкрыта ад 7 да 10 гадзін вечара.
Нав. К-т „Союзоргучет".

Усебеларускі індустрыяльны тэхнікум будматэрыялаў
аб'яўляе АСЕННІ НАБОР
на 1-ы курс. Тэхнікум рыхтуе высокакваліфікаваных тэхнікаў па агнетрывалых вырабах, грубай кераміцы, вяжучых матэрыялах і новых будматэрыялах. Курс навучання 4 гады. Іншагародніх тэхнікум забяспечвае інтэрнатам, паспяховымі прыкладамі (кождры, прасцірадлы). Ёсць сталоўка, цырульня. Стыпендыя ў памеры ад 40 р. і вышэй, у залежнасці ад паспяховасці.
Заявы прымаюцца да 10 жніўня.
Да заявы неабходна прыкласці дакументы (у арыгіналах): пасведчанне аб скончэнні сямігодкі метрычную выпіс, даведку аб соцстановішчы, аб стане здароўя, 2 фотакарткі, засведчаную анкету і пашто вых марак на 40 кап.
Пасля спецыяльнага адбору кожнаму будзе паведамлена аб дапушчэнні да іспытаў. Без паведамлення ў тэхнікум не прыязджаць.
Іспыты—з 16 да 23 жніўня па гранаведзнаўству, беларускай мове, матэматыцы, фізіцы, хіміі. Пачатак заняткаў 1 верасня 1934 г. Адрас: Гомель, Ветраная, 50.
Дырэкцыя.

АСЕННІ НАБОР У ПАЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ
НА ФАКУЛЬТЭТЫ: торфамеліярацыйны, хіміка-тэхналагічны, будаўнічы і энергетычны
ПРАЦЯГВАЕЦЦА
да 10 жніўня 1934 г.
Іспыты пачнуцца 10 жніўня, аб чым будзе асобна паведамлена кожнаму паступаючаму.
Па вечарам з 6 да 8 гадзін пры інстытуце арганізаваны кансультацыі для паступаючых па матэматыцы, фізіцы і хіміі.
Дырэкцыя.

МЕНСКІ ВЯЧЭРНІ ПЕДІНСТЫТУТ
аб'яўляе АСЕННІ ПРЫЁМ
на літаратурна-лінгвістычнае і соц. гістарычнае аддзяленні 1 курса.
Вячэрні педінстытут рыхтуе (без адрыву ад асноўнай працы) выкладчыкаў-спецыялістаў для поўнай сярэдняй школы, рабфакаў і тэхнікумаў.
Скончылыя вячэрні педінстытут набываюць усе правы скончыўшых дзённы.
Заняткі праводзяцца 3 разы ў шасці дзёнку ад 6—10 г. вечара.
Іспыты з 20 па 25 жніўня. Пачатак заняткаў з 1 IX—34 г.
ЗАЯВЫ і дакументы падаваць у канцылярыю ВПІ—Універсітэцкі Гарадок, галоўны корпус, пакой № 238. Там-жа падрабязныя даведкі па пытаннях прыёма.
Дырэкцыя.

ВЫДАВЕЦТВА „ЗВЯЗДА"
КУПЛЯЕ
ДОМ